

«СЭНС МАЙГО ЖЫЦЦЯ СЁННЯ — ДЗЕЦІ!» 5

УБАЧЫЦЬ ПРЫГАЖОСЦЬ ПРАЗ АБ'ЕКТЫЎ З ВЫШЫНІ ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

14 КАСТРЫЧНІКА 2021 г. ЧАЦВЕР № 198 (29567)

# Апора нашай дзяржавы

## Дарагія суайчынніцы!
## Ад усёй душы віншую вас з Днём маці!

*Сёння самыя шчырыя словы падзякі гучаць у адрас нашых дарагіх жанчын, якія здзейснілі вялікую місію працягу роду і жыцця на Зямлі.*

*Дзякуй за пяшчоту і цеплыню, з якімі вы сустракаеце немаўлят, што з'явіліся на свет, за любоў і клопат, якія дорыце дзецям усё сваё жыццё, за мудрасць і адданасць, якія дапамагаюць ім у далейшым дасягаць высокіх і высакародных мэт.*

*Мы схіляемся перад самаадданай працай шматдзетных маці, якія ствараюць будучыню нацыі. Ганарымся беларускімі жанчынамі, якія, паказваючы прыклад усвядомленага і адказнага мацярынства, паспяхова рэалізоўваюць сябе ў прафесіі і грамадскіх ініцыятывах. Захапляемся мамамі, якія выхавалі сапраўдных патрыётаў. Вы ўсе — апора нашай дзяржавы і заўсёды будзеце пад яе абаронай.*

*У гэты святочны дзень жадаю вам, дарагія мамы, вашым родным і блізкім моцнага здароўя і дабрабыту.*

*Няхай ваша жаночае і мацярынскае шчасце будзе бясконцае, а прамяністыя дзіцячыя ўсмешкі ўпрыгожваюць свет і натхняюць нас на новыя здзяйсненні на карысць роднай Беларусі.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота БелТА.

**Жыхарка Віцебска Наталля БУТАРОВІЧ са сваімі дзеткамі.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Беларусь накіравала сёлета 700 млн рублёў на даплаты медыкам, якія працуюць з COVID-19. Летась гэта было больш за Br0,5 млрд. Усяго сёлета на барацьбу з COVID-19 накіравана Br1230 млн. Сапраўды, адцягненне на барацьбу з COVID-19 фінансавых сродкаў дастаткова адчувальнае. Сёння на парадку дня — пытанні, звязаныя з сумеснай работай па барацьбе з COVID-19, перамяшчэннем грамадзян, актуалізацыяй пратаколаў лячэння гэтага захворвання, узаемным прызнаннем сертыфікатаў аб вакцынацыі, узаемным прызнаннем вакцын. Каб гэта быў не проста рынкавы складнік, а ў першую чаргу — прафілактычны складнік. Ёсць пэўныя шляхі барацьбы з COVID-19, розныя краіны з улікам рэкамендацый СААЗ выбралі ўласны шлях барацьбы з інфекцыяй. І жыццё паказала, што шлях, які абрала Беларусь, прадэманстраваў эфектыўнасць».*

## КОРАТКА

• **Сёння адбудзецца пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета, яно пройдзе ў анлайн-фармаце з удзелам кіраўнікоў дзяржаў ЕАЭС, прэзідэнтаў дзяржаў — назіральнікаў пры ЕАЭС — Кубы і Узбекістана, старшыні Калегіі ЕЭК.**

• Міністр абароны генерал-лейтэнант Віктар Хрэнін ва ўрачыстай абстаноўцы ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды і пагоны палкоўніка ваеннаслужачым Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

• **Беларусь плануе да канца года пачаць вытворчасць расійскай вакцыны «Спадарожнік V» па поўным цыкле.**

ISSN 1990 — 763X

Па палічках

# «Каб сямейны капітал выкарыстоўваўся эфектыўна і ўдумліва»

**Чарговыя навацыі ўнесены ў праграму сямейнага капіталу — адпаведны ўказ падпісаны днямі Прэзідэнтам. Аб тым, як трансфармуецца пад сучасныя рэаліі і як уплывае на дэмаграфічную сітуацыю дадзеная мера доўгатэрміновай падтрымкі сем'яў з дзецьмі, з якіх іншых «цаглінак» выбудоўваецца сістэмная дзяржаўная палітыка ў згаданай сферы, расказала ў інтэрв'ю міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ.**



***— Ірына Анатолеўна, кіраўнік дзяржавы ў сваім выступленні на нарадзе з кіраўніцтвам Саўміна па разглядзе праекта ўказа адзначыў, што падтрымка шматдзетных сем'яў — гэта сацыяльны брэнд нашай дзяржавы, яе візітная картка. Якія асноўныя меры фарміруюць гэты брэнд?***

— Галоўнае багацце нашай краіны — людзі, таму ў Беларусі многае робіцца для таго, каб адрадзіць традыцыі шматдзетнасці, павысіць каштоўнасць сям'і з трыма дзецьмі. Палітыка падтрымкі шматдзетнасці фарміравалася на працягу многіх гадоў, і сёння мы па праве ёю ганарымся. Яна разнапланавая і аказваецца па ўсіх жыццёва важных для сем'яў напрамках. Гэта і льготы пры аплаце паслуг у дзіцячых садках, і бясплатнае харчаванне ў школе, і адрасная сацыяльная дапамога, працоўныя, падатковыя, мытныя льготы, пенсійныя гарантыі шматдзетным маці.

СТАР. 2

# «Каб сямейны капітал выкарыстоўваўся эфектыўна...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сярод асаблівых мер — ільготы пры будаўніцтве жылля і сямейны капітал. Практычна кожная шматдзетная сям'я, якая знаходзіцца на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, можа мець магчымасць пабудаваць жыллё з падтрымкай дзяржавы. За апошнія пяць гадоў 35 тысяч шматдзетных сем'яў рэалізавалі такое права.

Сямейны капітал — гэта наша нацыянальная мера. Так скажам, падарунак дзяржавы за нараджэнне трэцяга або наступнага дзіцяці. Праграма вельмі прывабная для сем'яў. За перыяд яе рэалізацыі з 2015 года адкрыта 104,8 тысячы дэпазітных рахункаў, на якія залічана $824,5 млн і Br512 млн. Як вы ведаеце, у 2020 годзе праграма мадэрнізавана. Замест 18 гадоў дазволена датэрмінова расходаваць сродкі сямейнага капіталу, але на самае важнае: жыллё, медыцыну, адукацыю. З 2020 года прынята больш за 41 тысяч рашэнняў аб датэрміновым распараджэнні сродкамі сямейнага капіталу, з іх 88 працэнтаў — на паляпшэнне жыллёвых умоў.

***— Па якіх паказчыках можна меркаваць аб эфектыўнасці гэтых мер, іх пазітыўным уплыве на ўстаноўкі сем'яў мець як мінімум траіх дзяцей?***

— Аб эфектыўнасці мер сведчаць тэндэнцыі росту колькасці сем'яў з трыма і больш дзецьмі. З 2020 года міністэрствам створаны інфармацыйны рэсурс — аўтаматызаваная сістэма ўліку шматдзетных сем'яў. Так мы атрымліваем актуальную інфармацыю аж да раённага ўзроўню. Сёння ў нашай краіне пражывае ўжо больш за 116 тысяч шматдзетных сем'яў. Для параўнання: паводле даных перапісу насельніцтва 2009 года іх налічвалася 62,5 тысяч.

Пераважна сем'і выхоўваюць траіх дзяцей — больш за 80 працэнтаў. Самая шматдзетная — Брэсцкая вобласць, тут пражывае кожная пятая шматдзетная сям'я. 72 працэнты сем'яў — гарадскія, астатнія жывуць у сельскай мясцовасці.

Трэнды росту шматдзетнасці мы таксама бачым з чарговасці нараджэнняў. Калі па першых і другіх дзецях доля нараджэнняў у агульнай колькасці зніжаецца, то ўдзельная вага нараджэнняў трэціх і наступных дзяцей узрастае. У 2009 годзе іх доля складала 11 працэнтаў у агульнай колькасці народжаных, а ў 2019 годзе — ужо 23 працэнты.

Перапіс насельніцтва таксама паказаў, што за апошняе дзесяцігоддзе прыкметна павялічылася колькасць двухдзетных сем'яў — амаль на 43 тысячы сем'яў, або на 13 працэнтаў. Цяпер кожная трэцяя сям'я ў краіне — двухдзетная.

Інакш кажучы, за 10 гадоў адбыліся істотныя змяненні ў структуры і складзе сем'яў, двух-трохдзетная сям'я становіцца сацыяльнай нормай у грамадстве. Гэта вынік мэтанакіраванай палітыкі дзяржавы.



Пры гэтым мы добра разумеем, што, акрамя фінансавай падтрымкі, трэба павышаць прэстыж сям'і. Маладое пакаленне хоць і абазначае сям'ю ў прыярытэце сваіх каштоўнасцяў, тым не менш, адкладвае яе стварэнне на больш позні этап жыцця. Сярэдні ўзрост маці пры нараджэнні дзіцяці ўжо наблізіўся да 30-гадовага парога. Таму сям'я, яе каштоўнасці і традыцыі павінны быць у цэнтры інфармацыйнай палітыкі. Неабходна пашыраць праз СМІ ў якасці сацыяльнай нормы вобраз сям'і з трыма дзецьмі, павышаць культуру сямейна-шлюбных адносін.

***— Вы ўжо адзначылі, што сямейны капітал — папулярная мера. Што ў цэлым паказала практыка яго прымянення? І ў чым сутнасць асноўных падыходаў у адпаведнасці з новым указам?***

— Менавіта на падставе практыкі прымянення праграмы сямейнага капіталу мы выбудавалі ўказ па двух узаемадапаўняльных падыходах. Па-першае, гэта развіццё праграмы па асноўных напрамках, па-другое, увядзенне абмежавальных нормаў.

Па першым падыходзе ўзялі за аснову прапановы шматдзетных сем'яў, якія актыўна вывучалі ў ходзе дыскусійных пляцовак па ўсёй краіне. Мы вельмі ўзважана падышлі да гэтых прапаноў. Адразу скажу, што ўлічана не ўсё. Напрыклад, прапаноўвалася накіроўваць сродкі сямейнага капіталу на куплю аўтамабіля, рамонт жылля, пагашэнне спажывецкіх крэдытаў і іншае. Абмяркоўваючы гэтыя напрамкі з банкаўскім сектарам, іншымі дзяржаўнымі органамі, мы ўлічвалі, што сродкі сямейнага капіталу сёння працуюць у эканоміцы. Акрамя таго, іх накіраванне на штодзённыя спажывецкія патрэбы не адпавядае мэтам і задачам сямейнага капіталу як доўгатэрміновай падтрымкі.

Таму развіццё праграмы накіравана на пашырэнне ўжо існуючых напрамкаў. Новы напрамак — для сем'яў, у якіх выхоўваюцца дзеці-інваліды або бацькі маюць інваліднасць. Гэта перамяжоўваецца з палітыкай інклюзіі, якую мы праводзім для выканання Канвенцыі аб правах інвалідаў.

Другі падыход — па абмежаваннях — абумоўлены тым, што трэба было ўстанавіць дадатковыя фільтры. Практыка паказала, што асобныя сем'і неабдумана накіроўваюць сродкі сямейнага капіталу на куплю такога жылля, якое на самай справе жыллёвую праблему сям'і не вырашае. Вынік — сродкі патрачаныя, а гарантаваная дапамога дзяржавы, якая сям'і належыць у рамках ільготных крэдытаў або субсідый на будаўніцтва жылля, скарачаецца на набытую колькасць метраў. У выніку сям'я толькі страчвае.

Акрамя таго, аказваючы дзяржпадтрымку ў такіх аб'ёмах, дзяржава павінна ставіць «засłоны» для нядобрасумленных грамадзян, паколькі былі і выпадкі нямэтавага выкарыстання. Гэта не бюракратыя, гэта ашчадлівы падыход да дзяржаўных сродкаў. У цяперашніх умовах гэта асабліва запатрабавана. І павінна знайсці разуменне ў насельніцтва.

***— Якія канкрэтна абмежаванні замацаваныя ва ўказе?***

— Гэтыя нормы адносяцца да накіравання на паляпшэнне жыллёвых умоў і ўжо дзейнічаюць у рамках заканадаўства па аказанні дзяржпадтрымкі на будаўніцтва (рэканструкцыю) жылля. Напрыклад, грамадзяне, прымаючы рашэнне аб расходаванні сродкаў сямейнага капіталу на будаўніцтва або набыццё жылых памяшканняў, меншых за ўстаноўленыя нарматывы (15 кв. м, а ў Мінску — 10 кв. м на аднаго чалавека), будуць даваць згоду аб зняцці з уліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Пры гэтым сям'я зможа паўторна звярнуцца па пытанні пастаноўкі на ўлік тых, хто мае патрэбу, але толькі пры нараджэнні яшчэ аднаго дзіцяці.

Акрамя таго, устаноўлена забарона на адчужэнне пабудаваных або набытых з выкарыстаннем сродкаў сямейнага капіталу жылых памяшканняў на працягу пяці гадоў з даты рэгістрацыі права ўласнасці на іх. Тут прадугледжаны выключэнні, якія ўлічваюць асобныя жыццёвыя сітуацыі.

Таксама ўводзіцца абавязковая ацэнка кошту (на аснове рынкавых метадаў) жылых памяшканняў, што набываюцца. Мера накіравана на выключэнне выпадкаў завышэння кошту жылля пры заключэнні дагавораў куплі-продажу.

Яшчэ адна мера — устанаўленне забароны на набыццё жылля, якое ўключана ў рэестры старых і пустых дамоў. Такое жыллё, як правіла, непрыдатнае для пражывання, не мае элементарных выгод — лагічна выключыць магчымасць яго куплі.

У цэлым, гэтыя нормы забяспечаць больш узважаны падыход сем'яў да выбару магчымага жылля, а мясцовым выканаўчым і распарадчым органам дадуць механізмы кантролю за абгрунтаваным і мэтавым выкарыстаннем сямейнага капіталу. Задача — дапамагчы сям'і максімальна вырашыць пытанне з жыллём, а не патраціць сямейны капітал, вырашаючы яго часткова.

***— А якія навацыі па пашырэнні межаў выкарыстання сямейнага капіталу змяшчае ўказ? Можна прывесці канкрэтныя прыклады?***

— Дапоўнены фактычна кожны напрамак. Напрыклад, па напрамку паляпшэння жыллёвых умоў з'явілася магчымасць датэрмінова выкарыстоўваць сямейны капітал на пагашэнне пазыкі, выдадзенай арганізацыяй па месцы работы. Раней — толькі на пагашэнне банкаўскага крэдыту.

Дадзена права набываць долю кватэры або дома пры ўмове, калі становішся ўласнікам усяго жылога памяшкання. Гэта актуальна, калі жыллё, напрыклад, атрымліваецца ў спадчыну ад бацькоў і выкупляецца доля брата або сястры.

Важна адзначыць, што датэрмінова выкарыстоўваць сямейны капітал на жыллё могуць, як і раней, толькі сем'і, якія стаяць на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Такі падыход апраўданы — сёння ў вырашэнні жыллёвых пытанняў мае патрэбу больш як 40 тысяч шматдзетных сем'яў, і скарачэнне іх чаргі знаходзіцца ў прыярытэце жыллёвай палітыкі.

Па напрамку адукацыі пашыраны пералік устаноў. Аплачваць навучанне за кошт сямейнага капіталу можна будзе дзецям або бацькам, якія навучаюцца ў каледжах або Беларускім гандлёва-эканамічным універсітэце спажывецкай кааперацыі, а таксама ў Міжнародным універсітэце «МІТСО».

У медыцыне напрамак дапаўняецца за кошт магчымасці набыцця медыцынскіх вырабаў для правядзення складаных і высокатэхналагічных аперацый у артапедыі (цяпер — толькі ў кардыяхірургіі, нейрахірургіі, анкалогіі). Мы таксама ўлічылі інтарэсы шматдзетных сем'яў, у якіх ёсць інваліды. Яны змогуць набываць тавары і ўстройствы, што дапамогуць ім інтэгравацца ў грамадства. Гэта пад'ёмнікі, функцыянальныя ложкі, спецыяльныя камп'ютарныя ўстройствы (тактыльныя дысплэі і прынтары Брайля). Напрамак важны, паколькі гэтыя тавары даволі дарагія, іх кошт вар'іруецца ад Br700 да Br26 тысяч. Паводле ацэнкі, больш за 140 шматдзетных сем'яў змогуць скарыстацца новай мерай падтрымкі.

Усе навацыі ўступаюць у сілу з 1 студзеня 2022 года. У цэлым, усе гэтыя напрамкі сістэмнай і паслядоўнай палітыкі дзяржавы запатрабаваныя і актуальныя, яны накіраваны на павышэнне якасці жыцця сем'яў. Спадзяёмся, што новыя меры нададуць імпульс бацькам двух дзяцей (якіх сёння ў краіне больш за 650 тысяч) адважыцца на новы статус — шматдзетнай сям'і.

**БелТА.**

## Трэба ведаць

### ЯК БУДЗЕМ ПРАЦАВАЦЬ У 2022 ГОДЗЕ

**Савет Міністраў зацвердзіў графік пераносу рабочых дзён у 2022 годзе. Адпаведнае рашэнне замацавана пастановай Саўміна ад 11 кастрычніка 2021 года № 572, паведамілі ў прэс-службе ўрада.**

Згодна з дакументам, рабочыя дні ў 2022 годзе пераносяцца з панядзелка 7 сакавіка на суботу 12 сакавіка, з панядзелка 2 мая на суботу 14 мая. Такім чынам, вясной двойчы атрымаецца па чатыры выхадныя дні запар. Арганізацыям з улікам спецыфікі вытворчасці (работы) пакідаецца права самастойна ўстанаўліваць іншы парадак пераносу рабочых дзён.

### ХАРАКТАРЫСТЫКА АБАВЯЗКОВАЯ

**Прэзідэнт падпісаў Дэкрэт нумар 6, якім уносяцца змяненні ў Дэкрэт ад 15 снежня 2014 года нумар 5 «Аб узмацненні патрабаванняў да кіруючых кадраў і работнікаў арганізацый», паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Дакумент прыняты ў мэтах павышэння кадравага патэнцыялу дзяржаўных органаў і арганізацый, а таксама рэалізацыі змяненняў, унесеных у Працоўны кодэкс.

Дэкрэтам устанаўліваецца абавязак кіраўнікоў дзяржаўных органаў і арганізацый пры прыёме грамадзян на работу запытваць іх характарыстыкі з папярэдніх месцаў работы, а таксама звесткі з адзінага дзяржаўнага банка даных аб правапарушэннях у адносінах да кандыдатаў на кіруючыя пасады.

Акрамя таго, у дэкрэце вызначаюцца дакладныя патрабаванні да характарыстыкі. У ёй павінны будуць адлюстроўвацца прафесійныя, дзелавыя і маральныя якасці работніка, звесткі аб выкананні працоўнай і выканаўчай дысцыпліны, стаўленне да дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў.

Парушэнне прадугледжанага дэкрэтам парадку прыёму на работу, выдача характарыстык, якія змяшчаюць заведама недакладную інфармацыю, а таксама парушэнне тэрмінаў іх выдачы вядуць да прыцягнення да адказнасці, устаноўленай заканадаўствам.

Дэкрэт уступае ў сілу праз 10 дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання.

## Сітуацыя

# СТРЭЛЫ НА ГРАНІЦЫ

**Колькасць паведамленняў аб меркаваных парушэннях у дачыненні да мігрантаў у Літве ўзрасла з 14 да 20. Пра гэта заявіў кіраўнік Еўрапейскага агенцтва пагранічнай і берагавой аховы Frontex Фабрыс Легеры, паведаміў літоўскі тэлеканал LRT.**

«Каля 20 паведамленняў аб сур'ёзных інцыдэнтах з падазрэннем у парушэнні асноўных правоў у Літве», — сказаў Фабрыс Легеры, каментуючы інфармацыю аб парушэннях правоў мігрантаў на тэрыторыі Літвы. «Наколькі я разумею, прычынай гэтага з'яўляецца тлумачэнне літоўскага заканадаўства. Пытанне ў тым, ці сумяшчальны літоўскі закон аб кіраванні граніцамі і даванні прыстанішча з заканадаўствам ЕС», — сказаў кіраўнік Frontex. Агенцтва раней пакінула Венгрыю з-за парушэнняў правоў чалавека. На пытанне, ці пойдзе агенцтва з Літвы, дзе цяпер размешчаны дзясяткі яго афіцэраў, Фабрыс Легеры пакуль не адказаў.

Тым часам польскія сілавікі працягваюць запалохваць бежанцаў стрэламі. Пра гэта паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце. «Акрамя практыкаваных метадаў гвалтоўнай дастаўкі бежанцаў да беларускай граніцы, для польскіх сілавікоў стральба становіцца нормай. Беспакаранасць і адсутнасць рэакцыі польскіх уладаў на падобныя інцыдэнты падштурхоўваюць прадстаўнікоў Пагранічнай варты Польшчы на праяўленне ўсё большай агрэсіі ў дачыненні да мігрантаў, — расказалі ў ДПК. — Польскім бокам была дастаўлена з глыбіні тэрыторыі і пасля выцеснена да граніцы чарговая група бежанцаў з жанчынамі і дзецьмі. Замежнікі адкрыта заяўлялі, што ратуюцца ад вайны, прасілі вярнуць іх назад у Польшчу і дазволіць падаць пісьмовыя просьбы аб абароне. У адказ на просьбы адзін з польскіх вайскоўцаў стрэліў, а пасля накіраваў зброю на групу мігрантаў».

Акрамя таго, польскія сілавікі разгарнулі перад мігрантамі ваенныя загароды, наўмысна ствараючы перашкоды, якія прадстаўляюць пагрозу для іх жыцця і здароўя. «Не выключана, што Пагранічная варта Польшчы і гэтым разам паспрабуе абвінаваціць беларускі бок у стральбе на граніцы, каб схаваць ад грамадскасці чарговы факт стральбы польскіх сілавікоў, — адзначылі ў ведамстве. — Са шкадаваннем неабходна прызнаць, што падобныя дзеянні польскіх праваахоўнікаў застаюцца па-за ўвагай з боку міжнародных праваабарончых арганізацый, еўрапейскіх СМІ і звычайных грамадзян ЕС».

**Пётр ДУНЬКО.**

З нагоды

# САЛДАЦКІ БУКЕТ

## Нават падчас тэрміновай службы вайскоўцы маюць магчымасць павіншаваць сваіх матуль

**Дзень маці для мінчанкі Марыны Варачковай, якая працуе на прадпрыемстве «АГАТ — сістэмы кіравання», — свята вельмі сімвалічнае. Больш а 20 гадоў таму акурат напярэдадні Пакрова, 12 кастрычніка, яна нарадзіла сына. Пра тое, што неўзабаве ва ўсіх маці з'явіцца асаблівы дзень, тады ніхто нават уявіць не мог.**



Як толькі на календары вызначылася адпаведная дата, Марына Іванаўна штогод атрымлівала ад свайго сына кветкі. Сёлетні год, думала жанчына, стане выключэннем. На тое ёсць сур'ёзная прычына — яе адзіны сын акурат у гэты час праходзіць тэрміновую службу ў войску.

Аднак на што толькі не пойдзе сучасная моладзь, каб парадаваць сваіх блізкіх! І дзеля гэтага неабавязкова парушаць воінскі статут. Дастаткова проста добрасумленна выконваць вайсковы абавязак — і кіраўніцтва заўсёды пойдзе насустрач. У выпадку з Дзянісам Варачковым атрымалася менавіта так. З дазволу камандзіра часці напярэдадні свята салдат сустрэўся са сваёй мамай — і гэтым разам Марына Іванаўна не засталася без сюрпрызу.

Жанчына працуе інжынерам-праграмістам на адным з вядучых прадпрыемстваў краіны па стварэнні аўтаматызаваных сістэм кіравання, апаратна-праграмных комплексаў і тэхнічных сродкаў. Сюды прыйшла па размеркаванні, на прадпрыемстве — ужо 34-ты год. Прадукцыя «АГАТ — сістэмы кіравання» шырока выкарыстоўваецца ва Узброеных Сілах. І Дзяніс Варачкоў, які служыць у 56-м асобным палку сувязі, — не выключэнне. Малады чалавек з'яўляецца кіроўцам-электрыкам тэлеграфна-тэлефоннага цэнтра палявога вузла сувязі.

Мама вайскоўца шчыра прызнаецца, што не вельмі ўзрадавалася, калі на сынава імя прыйшла павестка. Адзінае дзіця, выхоўвала яго без бацькі. Застацца без мужчыны ў доме, апынуцца на некаторы час адной не вельмі хацелася. Але калі Марына Варачкова даведалася, што Дзяніс будзе служыць недалёка ад дому ды яшчэ і ў войсках сувязі, да якіх у яе са зразумелай прычыны асаблівыя адносіны, смутак і хваляванне паступова зніклі. Ды і Радзіму ж нехта павінен абараняць!

— Войскі сувязі — інтэлектуальныя войскі, у любым выпадку служба пойдзе толькі на карысць, — упэўненая маці салдата. — Сын праслужыў усяго чатыры месяцы, а я ўжо цяпер магу сказаць, што ён стаў больш самастойны, сабраны і адказны.

Як маці Марына Іванаўна вельмі задаволеная, што сын служыць у Мінску. Калі ёсць магчымасць, яна па нядзелях наведвае яго. За добрую службу ў звальненне на некалькі гадзін адпускаюць і вайскоўца — каб паласаваўца мамінымі баршчом і блінамі, часу хапае.

— У арміі, насамрэч, кормяць смачна, — прызнаецца малады чалавек. — Стравы разнастайныя, каларыйныя — нам усяго дастаткова.

Дзяніс Варачкоў будзе служыць усяго год — вось сапраўды, вышэйшую адукацыю за плячамі не насіць, нават тэрмін службы на паўгода карацейшы, чым у астатніх. Малады чалавек скончыў аўтатрактарны факультэт БНТУ, таму з велікагрузнымі машынамі, якіх яму даверылі ў войску, малады чалавек на «ты». Ганарыцца, што і некалькіх месяцаў не прайшло, як яго прызвалі, а ўжо давялося паўдзельнічаць у галоўным іспыце двухгоддзя для беларускай арміі. Падчас сумеснага стратэгічнага беларуска-расійскага вучэння «Захад — 2021» Дзяніс амаль месяц знаходзіўся на палігоне. Гэты час згадвае з асаблівым хваляваннем і нават настальгіяй: калі яшчэ давядзецца браць удзел у падобных манеўрах...

Сёлетні Дзень маці Марына Варачкова, безумоўна, запомніць на ўсё жыццё. Яна выдатна разумее, што калі яе сына адпусцілі на сустрэчу, значыць, ён добрасумленна выконвае свой воінскі абавязак. А гэта для яе, у першую чаргу як для маці, дарагога вартае.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Аліны МАЗАВЕЦ.**

---

Армія

# ПОДЗВІГ У МІРНЫ ЧАС

**Учарашні дзень можна па праве лічыць другім днём нараджэння аднаго з вайскоўцаў, які праходзіць тэрміновую службу ў 11-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгадзе. На занятках па агнявой падрыхтоўцы, выконваючы практыкаванне па кіданні ручной гранаты, салдат выпусціў яе з рук у акоп.**

Як паведамілі ў Міністэрстве абароны, кіраўнік заняткаў старшы лейтэнант Аляксей Харламаў не разгубіўся і ў лічаныя секунды адцягнуў вайскоўца за межы акопа, закрыўшы яго сабой. Афіцэр атрымаў нязначныя траўмы. Салдат тэрміновай службы не пацярпеў.

**Вераніка КАНЮТА.**

---

Добрая навіна

# НА ПАЎДНЁВЫМ ЗАХАДЗЕ БРЭСТА ПАБУДУЮЦЬ НОВЫ МІКРАРАЁН

**Пад жылую забудову выдзелена каля 20 гектараў. Мікрараён будзе абмежаваны Варшаўскай шашой, вуліцамі Грыбаедава і Мытнай. Ужо ў пачатку зімы, як мяркуецца, участак пачнуць рыхтаваць пад забудову. Там трэба будзе прыбраць раслiннасць, зрэзаць урадлівы пласт, зрабіць падсыпку тэрыторыі і выраўняць яе, паколькі мясцовасць часткова нізінная і багністая. У 2022 годзе спецыялісты змогуць прыступіць да пракладкі інжынерных сетак, будаўніцтва жылля і транспартнай інфраструктуры.**

Па праекце, у новым мікрараёне плануецца ўзвесці будынкі зменнай вышыннасці. У некаторых жылых дамах прадугледжаны ўбудаваныя гандлёва-бытавыя памяшканні. На тэрыторыі раёна зарэзервавана месца для дзіцячага сада, намечана ўладкаваць ландшафтна-рэкрэацыйную зону.

З жылымі дамамі будзе суседнічаць забудова грамадскага цэнтра. У прыватнасці, на яго тэрыторыі размесцяцца інвестыцыйныя пляцоўкі, дзе ў перспектыве з'явяцца аб'екты адміністрацыйна-дзелавога, гандлёва-бытавога, культурнага прызначэння. У праекце дэталёвага планавання падкрэсліваецца, што важны горадабудаўнічы акцэнт мікрараёна — уезд у Беларусь з боку Польшчы, які будзе сфарміраваны забудовай грамадскага цэнтра.

Праект жылой забудовы мікрараёна плануюць рэалізаваць да 2025 года.

---

Чулі?

# На дзяжурстве — «COVID-патруль»

**У Мінску стартуе інфармацыйна-прафілактычная акцыя «COVID-патруль». Яе першыя мерапрыемствы пройдуць сёння з 18.00 да 20.00 у буйных гандлёвых цэнтрах сталіцы, дзе абсталяваны пункты вакцынацыі.**



Фота БРСМ.

Гэта ААТ «ГУМ» (пр-т Незалежнасці, 21), ГЦ «Galleria Minsk» пр-т Пераможцаў, 9), Гандлёвы дом «На Нямізе» (вул. Няміга, 8), ГЦ «Замак» (пр-т Пераможцаў, 65).

Галоўная місія маладзёжнага «COVID-патруля» — інфармацыйная. Валанцёры руху БРСМ «Добрае Сэрца» — удзельнікі акцыі — нагадаюць мінчанам і гасцям беларускай сталіцы пра абавязковае захаванне масачнага рэжыму, а таксама раскажуць аб важнасці своечасовай вакцынацыі, каб мінімізаваць распаўсюджванне віруса.

Пры Мінскім гарадскім камітэце БРСМ створаны валанцёрскі пул «COVID-патруля». У яго ўвайшлі маладыя людзі ва ўзросце ад 18 гадоў — камунікабельныя і стрэсаўстойлівыя. Важны складнік для ўдзелу ў праекце — добрае здароўе. Пажаданая наяўнасць «Сертыфіката аб вакцынацыі».

Маладыя людзі прайшлі навучанне і інструктаж. Падчас патрулявання яны будуць экіпіраваныя неабходнымі сродкамі аховы, спецыяльнымі бэйджамі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

---

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Палата прадстаўнікоў ЗША ўхваліла часовае павышэнне мяжы дзярждоўгу



Палата прадстаўнікоў Кангрэса ЗША, каб пазбегнуць дэфолту, ухваліла законапраект аб часовым павышэнні верхняй мяжы дзяржаўнага доўгу на 480 мільярдаў долараў да 3 снежня. Раней дакумент, які прайшоў праз працяглыя дэбаты паміж дэмакратамі і рэспубліканцамі, быў прыняты Сенатам. Як паведамлялася, у пачатку кастрычніка дзярждоўг ужо перавысіў дапушчальнае значэнне у 28 трыльёнаў долараў. Каб пазбегнуць дэфолту, рашэнне аб яго перавышэнні неабходна было заканадаўча афарміць да 18 кастрычніка. Дасягненне часовага кампрамісу дае рэспубліканцам і дэмакратам час, каб дамовіцца аб ліміце дзярждоўгу. Рэспубліканцы выступаюць катэгарычна супраць павышэння фінансавага паказчыка, заяўляючы, што гэта прывядзе да далейшага росту дзяржаўных выдаткаў. Міністр фінансаў ЗША Джэнэт Елен раней заявіла, што сама па сабе наяўнасць мяжы дзярждоўгу становіцца ўсё больш небяспечнай для Злучаных Штатаў.

### Прэзідэнт Чылі абвясціў рэжым надзвычайнага здарэння з-за серыі падпалаў



Себасцьян Піньера аб'явіў надзвычайнае становішча ў шэрагу рэгіёнаў на поўдні краіны, паведаміла ТАСС. Такі крок абумоўлены «цяжкімі парушэннямі грамадскага парадку», заявіў Себасцьян Піньера ў звароце, які трансляваўся ў Twitter. Рэжым надзвычайнага здарэння абвешчаны на 15 дзён. Падпісаны кіраўніком дзяржавы ўказ дазваляе прыцягваць да забеспячэння парадку вайскоўцаў. «Гэты рэжым надзвычайнага здарэння патрэбен для больш эфектыўнай барацьбы з тэрарызмам, наркагандлем і арганізаванай злачыннасцю і ні ў якім разе не накіраваны супраць прадстаўнікоў нейкага народа ці групы мірных грамадзян», — сказаў Себасцьян Піньера. У рэгіёнах Бія-Бія і Араўканія ўжо некалькі гадоў адбываюцца падпалы цэркваў, уласнасці прадпрыемстваў, грузавікоў і іншых аб'ектаў. У апошнія тыдні такія выпадкі пачасціліся.

### У Кувейце жанчынам дазволілі служыць у войску



Міністр абароны гэтай краіны Хамад Джабер Алі ас-Сабах падпісаў указ, у адпаведнасці з якім жанчыны атрымалі права несці службу ва Узброеных сілах у шэрагу падраздзяленняў. Пра гэта паведаміла Кувейцкае інфармацыйнае агенцтва (KUNA). Адзначаецца, што кувейцкія жанчыны ўжо неаднойчы даказвалі здольнасць дзейнічаць нароўні з мужчынамі «ва ўсіх сферах, у самых складаных умовах і перыядах, праз якія прайшла краіна». «Таму надышоў час даць ім магчымасць праходзіць службу ў войску Кувейта поруч з мужчынамі», — прыводзяць словы міністра абароны Кувейта KUNA. На першых этапах жанчыны змогуць служыць у медыцынскіх і дапаможных падраздзяленнях кувейцкай арміі ў якасці малодшых афіцэраў і спецыялістаў.

# НАЙВЯЛІКШЫ ДАР

## Прысвячаецца ўсім маці без выключэння

**Ордэн Маці — дзяржаўная ўзнагарода, яна ўручаецца грамадзянкам Беларусі, якія маюць ад пяці дзяцей і больш. Але бываюць жанчыны, якіх узнагароджвае, напэўна, само жыццё. Гераіня матэрыялу даведалася пра сваю «ўзнагароду» якраз на Дзень маці, але лічыць, што яна проста захавальнік гэтага вялікага дару.**

### Рашэнне

Усведамленне таго, што адбылося, да Наташы прыйшло не адразу. Яна маладая 26-гадовая дзяўчына, якая скончыла журфак і была поўная сіл і планаў. Змяніла некалькі работадаўцаў і ў рэшце рэшт зразумела, што яе жыццё нейкае фальшывае. Ёй здавалася, што яна добра пісала пра падзеі і герояў, проста ўсё гэта ўмела фіксавала. Самой жа дзяўчыне хацелася быць патрэбнай, здзяйсняць важнае і неабходнае, быць удзельніцай жыцця, а не назіральніцай. Таму Наталля вырашыла ўвасобіць сваю дзіцячую мару і ўзяць на выхаванне сірот з дзіцячага дома. І не паспела... Цяпер вось ляжыць, не рухаючыся, з мікраінсультам на бальнічным ложку.

Наташа заплакала: так і не зрабіла нічога САПРАЎДНАГА ў сваім жыцці...

— Зараз ужо разумею: тая сітуацыя прымусіла мяне адсеяць са свайго жыцця няважнае і дадала рашучасці, — гаворыць Наталля. — З дапамогай мужа праз паўгода я ўжо аднавілася. Было ясна, што з-за перанесеных мной мноства хвароб дзяцей сваіх у мяне не будзе. З-за гэтага не гаравала — мне хацелася жыць і быць карыснай. Марыла стварыць дзіцячы дом сямейнага тыпу. Муж, у адрозненне ад мяне, сутыкаўся з дзецьмі, якія страцілі бацькоў, і разумеў, што дапамагчы ім няпроста. Ён тлумачыў пра ўнутраныя рэсурсы, фінансавыя, расказваў пра складанасці, якія ўзнікаюць з гэтымі дзецьмі, але мяне нічога не палохала. Памятаю, як ён спытаў: «Чаму ўсё ж такі мы?» Я тады ўпэўнена заявіла, што калі б мільёны загінулых у Вялікую Айчынную так разважалі, то дзе мы б зараз жылі? Вось пасля гэтага ён і пагадзіўся.

Спачатку Наталля звярнулася ў органы апекі свайго раёна, каб ёй дапамаглі знайсці дзяцей. Але падалося, што там з ёй не вельмі добра пагаварылі, і яна стала шукаць дзяцей у іншых раёнах. Хутка трапіла на аб'яву аднаго з прытулкаў для дзяцей. Аказалася, там запланавалі рамонт і ўсіх дзяцей аддалі ў прыёмныя сем'і ці родным. Толькі дваіх падлеткаў, брата і сястру 13-14 гадоў, ніхто не захацеў браць, і тыя ўжо некалькі месяцаў былі вымушаны жыць у бальніцы. Наталля была ўражана. Яна прыйшла дадому і расказала мужу аб гэтых дзецях.

— Нездарма мне не захацелася супрацоўнічаць з органамі апекі нашага раёна, — гаворыць Наталля. — Яны нядрэнныя, проста сустрэча з тымі дзецьмі — гэта быў лёс. Я веру, што прыёмным бацькам трапляюцца тыя малыя, ад якіх душа дарослых будзе развівацца, а дзецям — тыя дарослыя, якія неабходны ім. Не ведаю, што ў той вечар пачуў мой муж скрозь мае рыданні, але адчуў, што вось гэтыя падлеткі стануць нашымі першынцамі.

### Міша і Марына

Наталля аформілася прыёмнай маці і паехала па дзяцей. Іх аддалі ў вельмі старым адзенні.

— Я адчувала, як Мішку няёмка і сорамна перада мной з-за таго, што на ім была майка з маленечкімі дзіркамі і стрэлкамі, — успамінае жанчына. — Гэта быў 2006 года, і сістэма выплат дапамогі на дзетак была яшчэ недасканалая. Грошай у нашай сям'і вялікіх не было ніколі, але я не магла вытрымаць няёмкасць падлетка. Мы вырашылі па дарозе набыць дзецям адзенне. Мішка мой расквітнеў на вачах. Я вельмі радавалася, і мне здавалася, што ўсё ў нас атрымаецца.

Падлеткі былі вельмі адданыя сваім родным бацькам. Малыя, пакуль іх не забралі ў прытулак, на працягу некалькіх гадоў хавалі ад настаўнікаў праблемы дома. Яны часта галадалі, цыравалі сваё адзенне, рабілі «дамашку» пад вулічным ліхтаром. Стараліся, каб ніводны дарослы не здагадаўся, што іх бацькі выпіваюць. Дзеці не хацелі ў прытулак. Нягледзячы на іх няпростыя выпрабаванні ў дзяцінстве, Наталля бачыла, як падлеткі сумуюць без бацькоў. Яна не стала забараняць ім час ад часу ездзіць да іх. Хутка Наталлю чакала расчараванне.

— Мне здавалася, што ў нас выбудаваліся добрыя даверныя зносіны. Канешне, не без праблем, у прынцыпе, як з усімі падлеткамі, — успамінае жанчына. — Але для мяне стала сапраўдным ударам, калі мяне знайшлі суседзі родных бацькоў Мішкі і Марыны. Аказалася, дзеці на працягу некалькіх месяцаў крадуць ежу і прывозяць усё сваім бацькам. А тыя ходзяць па раёну і выхваляюцца тым, што яны забяспечаны ўсім неабходным дзякуючы іх кемлівым падлеткам, застаецца толькі знайсці на «бутэльку».

Для нявопытнай Наталлі гэта здавалася сапраўднай здрадай. Але яна хутка ўзяла сябе ў рукі. Разумела, што крыкі і пакаранне толькі ўзмоцняць праблемы і аддаляць іх адно ад аднаго. Жанчына пасадзіла падлеткаў насупраць і растлумачыла, што яны сваёй «дапамогай» забіваюць родных любімых бацькоў. І сапраўды, навошта дарослым ісці шукаць працу, мяняцца, нешта рабіць, калі ўсё гэта прынясуць іх дзеці, а выпіць каля крамы заўсёды знойдзецца з кім. Дзеці хацелі дадому, але самі аддалялі той час сваімі «паслугамі».



Наталля з Кацярынай.

Міша ў сям'і Наталлі пражыў два гады, Марына — каля чатырох. Дзяўчынка амаль у 18 гадоў вырашыла вярнуцца да роднай маці, якая старалася і кінула піць. Цяжка даўся Наталлі той суд, на якім Марыне дазволілі вярнуцца да родных. Такім чынам, дзяўчынка страціла ўсе льготы, якія ёй былі неабходны для паступлення, а яе маці перастала быць абавязанай. Але неўзабаве маці Марыны зноў запіла, а дзяўчынка зацяжарыла. У васямнаццаць Марына нарадзіла першынца.

— Уся гэтая сітуацыя давалася мне вельмі няпроста, — гаворыць Наталля дрыжачым голасам. — Нейкі час я думала, што нешта недадала ім. Але, нягледзячы на ўсе выпрабаванні, нам удалося зберагчы адносіны і з Мішам, і з Марынай. Я стала больш спакойнай, калі ўпэўнілася, што Марына спраўляецца з дзіцем. Мы з мужам задумаліся над тым, каб узяць яшчэ дзяцей на выхаванне.

### Ілья, Саша і Ганначка

Ілью было чатыры з паловай года, калі Наташа з мужам прыехала па яго ў дзіцячы дом. Хлопчык зусім не размаўляў, толькі мыкаў, але з інтанацыяй. Іншымі словамі, было адразу зразумела, што ён добра ведае мацерныя словы.

У Ільі былі вельмі дзіўныя паводзіны. Наталля ніяк не магла зразумець, дзе ў яго прабел ва ўспрыманні свету. Калі разумееш, дзе прабел, то заўважаеш яго, а тут было ўсё незразумела. Наталля пачала працаваць з базавай патрэбай дзіцяці — ежай. Справа ў тым, што ў Ільі ўся сістэма каштоўнасцяў змяшчалася ў акрайчыку хлеба. У дзіцячым доме выдавалі хлеб кавалачкамі, і акрайчыкаў было вельмі мала, таму дзеткі думалі, што гэта вельмі вялікая каштоўнасць. Наталля купляла хлеб, наразала па 12 акрайцаў для Ільі, выкладвала перад ім горачкай. Але гэта не дапамагала, ён вельмі хваляваўся, што рана ці позна прадукты скончацца. Наталля з мужам вырашылі купіць дом у вёсцы. Хлопчык убачыў вялізную колькасць гарбузоў, бочкамі засоленыя агуркі, стаў патроху супакойвацца і хутка перастаў хаваць прадукты.

У пяць гадоў хлопчык пачаў гаварыць. Тады ён Наташы і расказаў, што, калі яна зайшла ў групу ўся такая непрыгожая з марозу, ён раптам зразумеў: менавіта гэтыя людзі купяць яму веласіпед. Так у прынцыпе і здарылася. Прыкладна ў гэты час у сям'ю да Наталлі трапілі дзве сястрычкі — шасцігадовая Аляксандра і чатырохгадовая Аня. У Аляксандры да гэтага ўзросту быў вопыт дарослага жыцця. Яна сама выжывала і даглядала траіх дзяцей, у тым ліку адно немаўля. І калі дзяцей забралі з сям'і, то Аляксандра ўспрымала сітуацыю так, быццам бы гэта ў яе асабіста забралі малых. Дзяўчынцы патрэбны быў курс псіхатэрапіі. Яе сястрычка Аня — бясстрашнае стварэнне: менавіта яна некалі да прыходу ў сям'ю Наталлі выйшла з акна кватэры. Засталася жывая, але гэта быў не апошні няшчасны выпадак з ёй. Прыёмная маці прызнаецца, што калі сустракала траўматолага на вуліцы, то той дзякаваў ёй, што не ў яго кабінеце. Яна з дзецьмі часта да яго наведвалася, і не толькі з Ганнай.

— Тое, што я перажыла з гэтымі трыма — проста не ўмяшчаецца ў галаве, нават у мяне, — прызнаецца Наталля. — Дзеці былі вельмі сурёзна траўмаваны лёсам. Усе тыя рэчы, што адбываліся ў нас дома, страшна згадваць услых: спробы суіцыду, жорсткі гвалт у адносінах да іншых, руйнаванне ўсяго магчымага ў доме... Баялася, што ў мяне не атрымаецца ім дапамагчы, баялася, што іх адбяруць і гэта яшчэ больш траўміруе малых, якіх, як аказалася, ужо вярталі ва ўстанову... Разумела, што гэта іх апошні шанц, і ніколі не дапускала думкі, каб вярнуць маю «банду» ў прытулак. Праз гады жорсткай адаптацыі ў нашай сям'і мы прапанавалі дзяўчынкам іх удачарыць, а Ілью ўсынавіць. Мне здавалася, што гэта павінна дапамагчы ім супакоіцца і паверыць, што я, нягледзячы ні на што, ніколі і нікому іх не аддам. Гэты крок не вырашыў праблемы дзяцей, але дадаў ім упэўненасці ў тым, што цяпер у іх ёсць сапраўдная сям'я...

### Дзень маці

14 кастрычніка 42-гадовую Наталлю выклікалі чарговы раз на савет прафілактыкі ў школе, у якую, дарэчы, яна ўладкавалася працаваць, каб дзецям лягчэй было адаптавацца. Не, маці складаных дзяцей не збіраліся вінаваціць. Яе ўшчувалі за паводзіны сына. Жанчына ўстойліва вытрымала вымову, але, калі выйшла з кабінета дырэктара, раптам расплакалася. Вось табе і падарунак на Дзень маці, думала Наталля. Яна плакала надзвычай доўга, амаль рыдала і ніяк не магла супакоіцца. Яна адпусціла дзяцей з гуртковых заняткаў, якія павінна была правесці, а сама пассоўвала крэслы разам, легла на іх і заснула. Спала хвілін дваццаць і потым раптам адчула прыліў сіл. Такога раней не было! Звычайна Наталля доўга прыдумляла, як растлумачыць і данесці дзецям важныя рэчы, трывожылася і потым яшчэ доўга не магла аднавіцца ад стрэсу. А тут слёзы і сон... Наташа засумнявалася: хіба з яе здароўем гэта магчыма? Не магла зацяжарыць шмат гадоў, з чаго б гэта цяпер? Але ўсе ж набыла тэст на цяжарнасць. Ён аказаўся станоўчы. А далей усё як у сне. Яна прыходзіць да ўрача, які ўпэўнівае яе, што ўжо прайшла траціна цяжарнасці. Самі ж дактары, убачыўшы спіс захворванняў жанчыны, паклалі яе ў бальніцу амаль да самых родаў. А потым нараджэнне дачкі Кацярыны — цудоўнага падарунка ад Бога на Дзень маці.

— Думаю, гэта падарунак больш для майго мужа, — разважае Наталля. — Я такая шчаслівая, што магу аддзячыць за тое, што ён дапамог увасобіць мне мае мары. Без яго падтрымкі не справілася б. Я вельмі шчаслівы чалавек і маці. Мішка вырас працалюбівым мужчынам і нядаўна нам абвясціў аб тым, што знайшоў сабе нявесту. Марына — найцудоўнейшая маці дваіх дзетак, яна вельмі добра іх даглядае і выхоўвае. Аляксандра і Ілья летам паступілі ў каледжы і зараз атрымліваюць прафесіі. Кожны з іх унікальны, яны аматары прыгод, а цяпер яшчэ і галоўныя мае памочнікі. Ганна пакуль школьніца і вельмі таленавітая, добрая дзяўчынка. Заўсёды верыла і буду верыць у сваіх дзяцей. Так, мне часам бывае вельмі цяжка з імі, але я навучылася гэта ўспрымаць як працоўны працэс. Стараюся не забываць, што мы, людзі, носьбіты вялікага цудоўнага падарунка — жыцця. А бацькі — не проста носьбіты цуду, а яшчэ і захавальнікі. Дзеці мае паступова ўсведамляюць каштоўнасць жыцця і сям'і. Гэта адбываецца нават не заўсёды праз мяне, але МАЦІ — той падмурак, з якога дзеці пачынаюць будаўніцтва сваіх будучых цудоўных жыццяў.



Малюнак Аляксандры — дачкі Наталлі.

Імёны па просьбе герояў зменены.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Ірына ГЛАЗУНОВА:

# «СЭНС МАЙГО ЖЫЦЦЯ СЁННЯ — ДЗЕЦІ!»

## Гісторыя карэннай масквічкі, якая дзеля сям'і пераехала ў Беларусь

**У цэнтры нашай сённяшняй гісторыі Ірына Глазунова — мама Сафіі і Цімафея — калісьці вельмі паспяховая бізнес-лэдзі, якая дзеля сваёй сям'і адмовілася ад перспектыўнай работы ў Маскве і пераехала ў Беларусь. Як выгадаваць самадастатковых дзяцей? Наколькі моцна мама павінна быць інтэграваная ў іх жыццё? І на якім этапе дзяцей трэба адпусціць? Пра гэта і не толькі чытайце далей.**

### Службовы раман з працягам...

Сёння сям'я Юцэвічаў — Глазуновых» — гэта тата, мама, дачка і сын. Але ж так было не заўсёды. «Збоку можа паказацца, што наш тата ўзяў мяне ў жонкі з дзіцём. З Сафіяй у нас адно і тое ж прозвішча — Глазуновы. Насамрэч, усе дзеці ў нас з мужам агульныя, проста так склаліся жыццёвыя абставіны», — пачынае свой аповед Ірына.

Гісторыя Ірыны і Дзмітрыя пачалася са зносін па рабоце. Праз некаторы час дзелавыя зносіны ператварыліся ў штосьці большае, аднак пытанняў менш не стала. Масква — Мінск, розніца ва ўзросце... Ірына была ўпэўненая: нічога не атрымаецца. «Што мне падабаецца ў маім мужы: нягледзячы на тое, што ён на пяць гадоў маладзейшы за мяне, ментальна ён старэйшы, я і сёння жыву ЗА ім. Ён прымае рашэнні па-мужчынску рацыянальна і спакойна, даводзіць справу да канца, а мне застаецца проста быць побач з ім».

Пасля сустрэчы з Дзмітрыем усё атрымалася хутка і нечакана, перш за ўсё для самой Ірыны. «Акрылавыя пазногці, якія я рабіла на працягу 13 гадоў, раптам пачалі адвальвацца. Спачатку я не зразумела, у чым справа. Загугліла. Аказалася, адна з прыкмет — цяжарнасць. Я доўга не магла паверыць, што гэта здарылася ў маім жыцці!» Дзіма вельмі ўзрадаваўся такой акалічнасці і зрабіў Ірыне прапанову, але да загса пара так і не дайшла. Не было часу. «Я працавала практычна да родаў, работа на той момант для мяне была ўсім». Падчас цяжарнасці Ірына была ўпэўненая, што нараджаць будзе толькі ў Маскве, і не збіралася пакідаць сваё звыклае жыццё ў родным мегаполісе, нягледзячы ні на што. Адносіны «Мінск — Масква» працягваліся. І вось, нарэшце, з'явілася Соня.

### Тое самае пачуццё

«У раддоме пачуццё мацярынства да мяне так і не прыйшло. Галавою я разумела, што стала мамай, але на ўзроўні эмоцый не адчувала нічога». Прайшоў месяц. Ірыне патрэбна было зарэгістраваць дачку і зрабіць на яе цэлы пакет дакументаў. У Расіі гэта не толькі пасведчанне аб нараджэнні, а яшчэ медыцынскі поліс, страхавое і пенсійнае пасведчанні. Дзеля такой важнай справы прыйшлося пакінуць маленькую Соню на бабулю. «Памятаю, як выйшла з дому, села ў машыну, гучна ўключыла музыку, еду, атрымліваю асалоду ад першага веснавога сонейка, і чым далей я ад дому, тым горш і горш мне становіцца. Адчуваю, як мяне пачынае «накрываць». І тут я разумею: вось яно, тое самае пачуццё мацярынства! За 20 хвілін я зрабіла ўсе свае справы і вярнулася дамоў, таму што зразумела: там засталася частка мяне». Паколькі Дзіма не змог прыехаць, каб зарэгістраваць Соню, а чакаць яго не было часу, Ірына аформіла дачку на сваё прозвішча — Глазунова — і атрымала статус «маці-адзіночка».

### Сардэчна запрашаем у Беларусь!

Адносіны на адлегласці працягваліся. Ірына наведвала Беларусь разам з маленькай Соняй, а гэта была ўжо зусім іншая нагрузка. «У Беларусі я сябе адчувала, як у вечным санаторыі. Усё чужое, нікога не ведаю, вельмі павольны, па маскоўскіх мерках, тэмп жыцця. Прыязджаць сюды на некаторы час — гэта адно, жыць тут — зусім іншае». У рэшце рэшт Ірына прыняла рашэнне: трэба разыходзіцца — і акрэсліла сваю пазіцыю Дзіме. «З адным дзіцем я цудоўна спраўлюся сама. Ты супер-тата, у любы момант можаш прыязджаць і праводзіць час з дачкой. Але жыць на два гарады больш не магу. Я стамілася». На гэта Дзіма мудра прапанаваў паехаць у адпачынак, апрытомнець і пасля, вырашыць, што рабіць далей. Так і зрабілі. З курорта Ірына вярнулася цяжарная. «Дзіма прыняў рашэнне за нас дваіх: мы будзем жыць доўга, шчасліва і — разам! Цімошу я нараджала таксама ў Маскве, і мы ўсё яшчэ не былі жанатыя». Але ж гэтым разам прозвішча для сына не абмяркоўвалася — Юцэвіч, як у таты. Распісалася пара крыху пазней дзеля таго, каб унесці сваіх дзяцей у пашпарты і атрымаць пасведчанне на правы жыхарства. Калі Цімошу споўнілася паўгода, жыць на два гарады стала зусім нерэальна, вось тады і было прынята рашэнне жыць разам. Пахрысцілі Цімошу ў Беларусі, і вось ужо шэсць з паловай гадоў Ірына тут.

### Жыццё да і пасля нараджэння дзяцей

Ірына шчыра прызнаецца, што са з'яўленнем дзяцей ёй прыйшлося недзе адмовіцца ад сябе, ад сваіх жаданняў, хобі і сяброў. Але ў той жа час жанчына атрымала штосьці большае, чым усё вышэйпералічанае. «Я б падзяліла сваё жыццё на два асобныя фільмы: да і пасля з'яўлення дзяцей. Не скажу, які з іх мне падабаецца больш. Гэта дзве абсалютна розныя кінастужкі. Да з'яўлення дзяцей я не разумела, дзеля чаго жыву, не цаніла грошы, працавала, таму што люблю мець стасункі з людзьмі, быць у цэнтры падзей. Працавала-працавала — але навошта? Цяпер у мяне ўсё па-іншаму: я ведаю, для чаго і для каго я жыву! Вядома, я штосьці страціла асабіста, запаволіла сваё развіццё, але я разумею, што цяпер укладваю ўвесь свой час і энергію ў самае дарагое, што ў мяне ёсць, — у сваіх дзяцей».

Калі надышоў час дзецям ісці ў садок, Ірына зрабіла спробу вярнуцца на работу, але сумяшчаць яе з доглядам за дзецьмі не атрымалася. Нягледзячы на фінансавыя магчымасці, Ірына зразумела, што не можа давяраць выхаванне сваіх дзяцей няньцы. Як чалавек, для якога не існуе залатой сярэдзіны, вырашыла, што будзе займацца выключна дзецьмі, бо адчувалася, што ім вельмі патрэбная мама. «Але ж я не магу проста сядзець дома. Я ж энергічная. «Ёсць прапанова пайсці на танцы. Спрабуем?» І мы ўсе разам едзем на танцы».

### Самае дарагое ў жыцці чалавека — гэта час

Дзякуючы энергічнай маме, дні Сафіі і Цімошы распісаныя амаль па хвілінах. Дзеці спрабавалі ўсё, што толькі можна. Танцы, гімнастыка, выяўленчае мастацтва, каратэ, літаратурны гурток, англійская мова, музычная школа... «Калі мы спрабуем штосьці новае, і я разумею, што ім падабаецца, мы працягваем гэтым займацца. Не падабаецца — я не настойваю, чаго марнаваць час! Тлумачу дзецям: грошы, стасункі з людзьмі — усё гэта крута. Але самае бясцэннае, што вы ніколі не набудзеце, — гэта час, а ён вельмі імклівы. Цаніце свой час, цаніце мой час. Калі ім не падабаецца той ці іншы занятак, адмаўляемся ад яго і далей спрабуем штосьці новае. Калі я адчуваю, што ў іх атрымліваецца, але ёсць нейкія стомленасць і лянота, мы можам зрабіць міні-адпачынак і прапусціць некалькі заняткаў». Акрамя таго, Ірына прывучае дзяцей рабіць любую справу якасна і з самааддачай. «Калі прыходзім на трэніроўку па каратэ ці на ўрок музыкі, мы павінны не проста адбыць гэты час, а адпрацаваць яго на 100 працэнтаў. Галоўнае — быць нацэленымі на вынік. Пасля заняткаў — калі ласка, гутарыце з сябрамі, адпачывайце, жартуйце».



### Калі ёсць пэўныя інтарэсы, няма месца дрэнным звычкам

Дрэннае ўспрымаецца хутчэй, добрае трэба укладваць. Так пабудаваны чалавек. Таму Ірына асэнсавана робіць усё, што ад яе залежыць, каб засцерагчы дзяцей ад псіхалагачнай, фізічнай і ментальнай дэградацыі. Якім чынам? «Я іх загружаю. Нашы шматлікія актыўнасці фарміруюць пэўнае кола стасункаў. Напрыклад, навошта нам патрэбны спорт? Я хачу, каб вакол нас былі дзеці спартыўныя, у жыцці якіх ёсць пэўныя інтарэсы і няма дрэнных звычак. Яшчэ адзін момант. Я ненавіджу і не разумею «Tik-Tok». Лічу, што ў папулярных сацсетках цяпер, на жаль, няшмат якаснага кантэнту. Акрамя таго, што гэты кантэнт вядзе дзяцей да дэградацыі, яны пачынаюць верыць, што можна стаць мільянерам так проста, нічога не зрабіўшы ў сваім жыцці. Такога не бывае. Каб мець дастатак, трэба працаваць, і вельмі шмат. Калі я бачу «заліпанне» ў смартфонах, то задаю пытанне: «У вас шмат вольнага часу? Тады трэба яго яшчэ чым-небудзь загрузіць». Вядома, Ірына разумее, што не зможа пабудаваць жыццё сваіх дзяцей за іх саміх. Але ўпэўненая, што пакуль можа ім дапамагчы і накіраваць у правільны бок, абавязкова будзе гэта рабіць. Нягледзячы на тое што сёння Ірына цалкам прысвячае свой час развіццю і інтарэсам дзяцей, яна разумее: чым больш сталыя яны становяцца, тым больш волі ім трэба даваць.

### Крыніца энергіі і добрага настрою — у фізічнай актыўнасці

«Калі ты цалкам прысвячаеш сябе дзецям, цябе перастаюць паважаць як асобу. Безумоўна, цябе любяць як маму, але гэта іншае. Перш за ўсё, ты — чалавек-функцыя. Я не ідэальная, у мяне, як у кожнай нармальнай жанчыны, ёсць перыяды стомленасці, але я не магу доўга ныць. Найлепшы выхад — змена дзейнасці і фізічная актыўнасць». Спорт, лазня, выхады ў тэатр, стасункі з даўнімі сяброўкамі. Як прызнаецца Ірына, усё гэта дае ёй невераготную энергію. І, безумоўна, моцна саграваюць душу планы па самаразвіцці. «Хачу пачаць вучыць англійскую мову, і ёсць яшчэ адна мара, але гэта пакуль сакрэт».

### Самае галоўнае ў адносінах з дзецьмі — шчырасць

«Спачатку ты патрэбны дзецям, як агонь, паветра і вада. І ты павінен усе свае інтарэсы прыбраць на некаторы час. Твая асноўная задача — залажыць у сваіх дзяцей тыя асновы духоўнасці, якія яны ўспрымуць, пяроймуць і перададуць пазней ужо сваім дзецям». Ірына разумее, што дзеці маюць свой асабісты лёс, яны сталеюць і зусім хутка надыдзе той этап, калі іх трэба будзе адпусціць. Таму з маленства Ірына вучыць: «Для мяне і таты вы — самыя лепшыя. Для астатняга свету па-за межамі нашага дому вы — неідэальныя. Там вы павінны пастарацца быць лепшыя. Дзеля гэтага патрэбна развіваць свае найлепшыя якасці. Жыццё непрадказальнае, таму, што ні здарылася б з вамі па-за межамі дому, вы заўсёды можаце звярнуцца да нас з татам па дапамогу і параду. Разам мы заўсёды знойдзем выхад з любой сітуацыі. Шчырасць у адносінах — гэта самае галоўнае!»

**Кацярына ТУМАС-ЦІШКЕВІЧ.**

**Фота з асабістага архіва Ірыны Глазуновай.**



## ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «Нам 25! Покупай, чтобы играть!»

**1**. Настоящая Рекламная игра называется «**Нам 25! Покупай, чтобы играть!**» (далее – Игра, Рекламная Игра), проводится в соответствии с условиями настоящих правил (далее – Правила) согласно требованиям законодательства Республики Беларусь, без взимания с участников Игры платы.

**2. Сведения об организаторе**.

Организатором Игры является Общество с ограниченной ответственностью «Яскрава», УНП 191548102, зарегистрировано 16 ноября 2011 г. решением Минского городского исполнительного комитета в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191548102 (далее – Организатор).

Юридический адрес и местонахождение Организатора: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ольшевского, 22, оф. 902

Адрес электронной почты Организатора: visa@yaskrava.by.

**3. Территория проведения Игры** – Республика Беларусь.

**4. Период проведения Игры** – с 15.10.2021 по 20.01.2022 (включительно), включая период вручения выигрышей и опубликования результатов проведения Игры.

**5. Состав комиссии по проведению Игры**.

Члены комиссии:

Жуковская Алла Анатольевна – главный специалист ЗАО Банк ВТБ (Беларусь);

Борисёнок Анастасия Алексеевна – главный специалист ЗАО Банк ВТБ (Беларусь);

Богдусевич Ирина Сергеевна – ведущий специалист ООО «Яскрава»;

Бельская Анна Николаевна – ведущий специалист ООО «Яскрава»;

Павлющик Инна Викторовна – индивидуальный предприниматель.

**6.** Игра проводится в целях стимулирования безналичных расчетов (далее – Безналичные операции) физическими лицами с использованием банковских платежных карточек международной платежной системы Visa, эмитированных ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) (далее – Банк), в том числе Виртуальных карточек (эмитированных без использования материального носителя), с любой валютой счета, за исключением корпоративных карточек Visa Business (далее – Карточка).

В настоящих Правилах термин «Карточка» используется в значении, определенном статьей 273 Банковского кодекса Республики Беларусь: банковская платежная карточка – платежный инструмент, обеспечивающий доступ к банковскому счету, счетам по учету банковских вкладов (депозитов), кредитов физического или юридического лица для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**7. Участники Игры**.

**7.1.** Участниками Игры могут быть физические лица, держатели Карточки **Visa**, **эмитированной ЗАО Банк ВТБ (Беларусь),** достигшие 18 лет – граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь **и выполнившие требования, необходимые для участия в Рекламной игре**.

**7.2.** Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором или с Банком, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства. Члены комиссии также не могут быть участниками Игры.

**8. Состав и размер призового фонда.**

*Таблица 1*

| № | Название | Далее в Правилах | Кол-во, шт. | Стоимость за единицу с НДС, бел. руб. | Итого, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Денежный приз в размере 2500 белорусских рублей | Приз 1 | 4 | 2500,00 | 10 000,00 |
| | Дополнительные денежные средства | | | 351,15 | 1 404,60 |
| 2 | Денежный приз в размере 100 белорусских рублей | Приз 2 | 120 | 100,00 | 12000,00 |
| 3 | Денежный приз в размере 50 белорусских рублей | Приз 3 | 280 | 50,00 | 14000,00 |
| 4 | Денежный приз в размере 25 белорусских рублей | Приз 4 | 600 | 25,00 | 15000,00 |
| | **Итого** | | | **52 404,60** | |

**8.1.** Призовой фонд Игры составляет 52 404 (пятьдесят две тысячи четыреста четыре) белорусских рубля 60 копеек и формируется за счет денежных средств Организатора.

**9. Условия участия в Игре.**

**9.1.** Для участия в Игре необходимо выполнить следующие условия:

**9.1.1.** Являться и/или стать держателем Карточки.

**9.1.2.** Для участия в розыгрыше Призов:

совершить не менее двух безналичных операций по оплате товаров/работ/услуг с использованием Карточки и/или посредством платежных сервисов PAY (Apple Pay, Samsung Pay, Garmin Pay, Fitbit Pay, Кошелек Pay) на сумму не менее 25,00 (двадцать пять) белорусских рублей каждая (общая сумма не менее 50,00 (пятидесяти) белорусских рублей) или в иной валюте на сумму, эквивалентную указанной сумме в белорусских рублях по курсу соответствующей валюты, установленному Национальным банком Республики Беларусь на дату совершения соответствующей безналичной операции, за исключением операций, указанных в пункте 9.2. Правил в каждый игровой период, указанный в Таблице 2.

9.1.3 Операции, участвующие в Игре, не суммируются. Сумма одной операции не может быть разделена.

Например, одна операция на 50 (пятьдесят) рублей не может участвовать в Игре как две операции на сумму 25 (двадцать пять) рублей.

9.1.4. Участник получает один игровой шанс за каждые две операции, соответствующие условиям Правил пункта 9.1.2. Каждому игровому шансу после выполнения обязательных условий участия в Игре присваивается 1 (один) порядковый номер по дате и времени совершения второй операции. В случае полного совпадения времени совершения транзакций, порядковый номер присваивается по уникальному идентификационному номеру транзакции в порядке возрастания.

9.1.5 Согласие на участие в Рекламной игре, а также на предоставление ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), Организатору информации, составляющей банковскую тайну, подтверждается Участником при заключении им Договора об использовании карточки с Банком на условиях в порядке и по форме, установленной Банком.

**9.2. <u>Не являются</u>** основанием для участия в Игре:

- безналичные операции, совершенные до 15.10.2021 и после 09.12.2021;

- безналичные операции на общую сумму, не соответствующую любому из условий, установленных в п. 9.1. настоящих Правил;

- операции по погашению кредитов/факторинга/лизинга/А1 Кошелек, пополнению банковских вкладов (депозитов), счетов и оплате банковских комиссий, а также переводы денежных средств с одной карточки на другую (в том числе на карточки других банков) и переводы со счета на счет, переводы с карточки на счет и со счета на карточку;

- операции, совершенные в устройствах самообслуживания и сервисах https://e-pay.by/, https://pay.bgpb.by и аналогичных им, за исключением операций оплаты товаров/работ/услуг, совершенных посредством системы дистанционного банковского обслуживания Интернет-банк ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) «VTB mBank (Belarus)» (WEB-версия/мобильное приложение);

- операции безналичной оплаты в казино и иных игорных заведениях, оплаты ставок и пари;

- операции безналичной оплаты финансовых и брокерских услуг;

- операции по приобретению электронных денег;

- операции по оплате услуг мобильных операторов и Интернет-провайдеров;

- операции, по которым был осуществлен возврат товаров/услуг с перечислением денежных средств на Карточку Участника;

- операции безналичной оплаты в устройствах банков, установленных в РУП «Белпочта».

**9.3. <u>В Игре участвуют</u>** операции безналичной оплаты товаров и услуг, совершенные с использованием Карточки в период с 15.10.2021 по 09.12.2021. Определение операций, соответствующих настоящим Правилам, производится отдельно по каждому счету участника Игры. В случае если одно физическое лицо выполнило настоящие условия участия в Игре по нескольким счетам, данное физическое лицо фиксируется в качестве участника в списке участников Игры соответствующее количество раз.

Одно физическое лицо может участвовать в Игре неограниченное количество раз при выполнении им условий, указанных в п. 9.1 Правил.

9.4. Организатор оставляет за собой право проверки данных о достоверности совершенных операций участниками Игры, в том числе обратиться в Банк в целях проверки совершенных операций на предмет их соответствия Правилам (с соблюдением требований законодательства о банковской тайне и персональных данных физических лиц).

**10. Порядок проведения розыгрыша призового фонда**.

**10.1** Место проведения розыгрышей призов – г. Минск, ул. Ольшевского, 22, оф. 902.

**10.2.** Всего за период проведения Игры Организатором проводятся 4 (четыре) розыгрыша призового фонда, согласно Таблице 2, в ходе которого победители Игры будут определяться, исходя из присвоенных, в соответствии с условиями Правил, игровым шансам порядковых номеров.

*Таблица 2*

| Дата и время розыгрыша | Призы розыгрыша | Период совершения безналичных операций |
|---|---|---|
| 05.11.2021 в 14:00 | Приз 1, 1 штука | С 00:00:00 15.10.2021 по 23:59:59 28.10.2021 |
| | Приз 2, 30 штук | |
| | Приз 3, 70 штук | |
| | Приз 4, 150 штук | |
| 19.11.2021 в 14:00 | Приз 1, 1 штука | С 00:00:00 29.10.2021 по 23:59:59 11.11.2021 |
| | Приз 2, 30 штук | |
| | Приз 3, 70 штук | |
| | Приз 4, 150 штук | |
| 03.12.2021 в 14:00 | Приз 1, 1 штука | С 00:00:00 12.11.2021 по 23:59:59 25.11.2021 |
| | Приз 2, 30 штук | |
| | Приз 3, 70 штук | |
| | Приз 4, 150 штук | |
| 17.12.2021 в 14:00 | Приз 1, 1 штука | С 00:00:00 26.11.2021 по 23:59:59 09.12.2021 |
| | Приз 2, 30 штук | |
| | Приз 3, 70 штук | |
| | Приз 4, 150 штук | |

**10.3.** Для осуществления розыгрыша Организатор формирует список на основании данных об операциях, соответствующих условиям Игры, определенные п.9 Правил, предоставленных Организатору Банком. Список включает порядковые номера игровых шансов, присвоенные в соответствии с условиями Правил, уникальный идентификационный номер (ID) операции из учетной системы Банка, сумму, дату и время совершения операций, соответствующих условиям Правил, а также фамилию, имя, отчество участника, совершившего указанные операции (далее – «массив»).

**10.4.** Для определения выигрышных порядковых номеров Организатор использует лототрон и набор шаров в количестве 10 штук с цифрами от 0 по 9.

**10.5.** Определение выигрышных порядковых номеров (для призов 1–4) происходит путем их формирования слева направо из цифр в шарах, поочередно извлекаемых из лототрона.

**10.6.** Для определения цифры первого слева разряда выигрышного порядкового номера Организатор помещает в лототрон шары с цифрами от 0 до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего по порядку порядкового номера в массиве. Организатор извлекает из барабана один шар. Цифра из извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного порядкового номера.

**10.7.** Далее в лототрон загружаются все десять шаров, шары перемешиваются, и из лототрона извлекается шар, цифра в котором определяет цифру следующего разряда выигрышного порядкового номера. Производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах порядковых номеров массива. При наличии совпадения цифра вытянутого шара записывается в соответствующий разряд выигрышного порядкового номера – и шар возвращается в лототрон; в противном случае – извлеченный шар с цифрой не возвращается в лототрон, и Организатор извлекает следующий шар до получения нужного совпадения. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон цифр соответствующих разрядов порядковых номеров в массиве.

**10.8.** В ходе розыгрыша определение победителей призов проводится в последовательности, указанной в Таблице 2.

**10.9.** В случае, если порядковый номер игрового шанса участника в соответствующем розыгрыше, определенный согласно п. 10.4–10.8. Правил, совпадает с одним из зафиксированных ранее выигрышных порядковых номеров в таком розыгрыше, выигрышным считается порядковый номер игрового шанса другого участника, следующий за этим порядковым номером. В пределах одного розыгрыша участник может выиграть приз только один раз.

**10.10.** После определения победителей (основных победителей) розыгрыша для обеспечения полной выдачи призов Организатор осуществляет определение резервных победителей в количестве, соответствующем количеству победителей розыгрыша. Резервным победителем становится другой участник, которому принадлежит следующий порядковый номер игрового шанса, следующий за порядковым номером игрового шанса основного победителя, при условии, что он не попал в список основных победителей. В ином случае берется следующий порядковый номер до выполнения данного условия.

**10.11.** Приз вручается резервному победителю в случае, если основной победитель:

**10.11.1.** отказывается от получения приза, о чем письменно извещает Организатора;

**10.11.2.** нарушает (не выполняет) условия Правил, в том числе не предоставляет необходимые подтверждающие документы, указанные в Правилах, в сроки и в порядке, установленные Правилами;

**10.11.3.** не выходит на связь с Организатором и не является для получения приза в сроки, установленные Правилами (п. 11. Правил);

**10.11.4.** отказывается от подписания документов, фиксирующих факт выдачи приза, и иных документов, вытекающих из участия в Игре;

**10.11.5.** в ходе проверки Организатором установлен факт, что победитель в период участия в Игре осуществлял возвраты средств на карточку сумм операций, совершенных ранее и зафиксированных в Игре операций.

**10.12.** В случае если и основной, и резервный победитель, претендующие на получение призов не соблюдают условия Правил, в результате чего теряют право получения призов, такие призы остаются в распоряжении Организатора.

**11. Срок и способ информирования победителей розыгрыша, место, порядок и сроки вручения призов.**

**11.1.** Организатор уведомляет победителя о выигрыше путем рассылки смс, а также письмом на адрес электронной почты участника, а также дополнительно может уведомить звонком по контактному номеру телефона, имеющемся в распоряжении Организатора, или заказным письмом по адресу проживания в течение 3 (трех) суток после розыгрыша.

**11.2.** Победитель/резервный победитель призов 1–4 может получить выигранный им приз следующим образом:

Победителю необходимо отправить по адресу электронной почты visa@yaskrava.by отсканированные копии паспорта (стр. 31–33 и стр. 25), или вида на жительство, а также предоставить номер расчетного счета в белорусских рублях для зачисления Призов в срок до 24.12.2021 включительно. Перечисление призов победителям производится до 31.12.2021 включительно.

11.2.3. Резервные победители уведомляются в срок до 07.01.2022. Срок предоставления необходимых документов для перечисления сумм призов 1–4 для резервных победителей – до 14.01.2022 включительно. Срок перечисления призов 1–4 резервным победителям – до 20.01.2022 включительно.

**11.3.** Призы не подлежат замене. Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена количеством и видом призов, указанных в Правилах.

**11.4.** При получении призов победители несут все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога производится в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь, и осуществляется Организатором. Удержание с победителей подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) в момент выдачи приза из денежной части приза (денежная часть приза удерживается Организатором для уплаты подоходного налога в установленном размере).

**12. Права и обязанности участников Игры.**

**12.1.** Факт участия в Игре подразумевает, что участники соглашаются на безвозмездной основе давать рекламные интервью об участии в Игре и использовании призов Игры, в том числе по радио, телевидению, в Интернете и в иных средствах массовой информации, а также участвовать в видео, аудио и фотосессиях для изготовления рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Все права, в том числе исключительные имущественные права, на такие материалы будут принадлежать Организатору на безвозмездной основе.

12.2. Участием в Рекламной игре Участник подтверждает ознакомление и полное согласие Участника с настоящими Правилами и принятие на себя обязательств полностью соблюдать все их условия, а также требования законодательства Республики Беларусь, вытекающие из участия в Игре и/или связанные с получением призов в результате участия в Игре.

**13. Наименование печатного издания средства массовой информации для публикации Правил и результатов розыгрыша, сроки публикации.**

**13.1.** Правила Игры подлежат публикации в газете "Звязда" до начала Игры.

**13.2.** Результаты Игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 14.01.2022.

**14. Общие положения.**

**14.1.** Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Игры, а также результаты проведения Игры, могут быть обжалованы в установленном законодательством порядке.

**14.2.** Организатор оставляет за собой право проверки данных о достоверности совершенных операций Победителями Рекламной игры.

**14.3.** Компания Visa и любые ее аффилированные лица, как и Банк и любые его аффилированные лица (за исключением лиц, входящих в состав Комиссии по проведению Игры), не являются Организатором, не принимают участия в розыгрыше, а также определении победителей, за исключением лиц, входящих в состав Комиссии по проведению Игры, не несут ответственности за соблюдение Организатором Правил, законодательства Республики Беларусь, а также не отвечают по претензиям участников Игры.

**14.4.** Организатор не несет ответственность, если не по вине Организатора у участника отсутствует доступ к сети Интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги сети Интернет), к электронной почте, за работу операторов сотовой подвижной электросвязи (плохое соединение с участником и т.д.), почтовой службы (сроки доставки и т.д.). Организатор не компенсирует участнику расходы, связанные с оплатой транспортных расходов при посещении офиса Организатора.

**14.5.** Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с Участником в случае предоставленной Участником Организатору или Банку недостоверной информации о его контактных данных.

**14.6.** Информацию об условиях участия и проведения Игры можно получить по телефону «горячей линии» Организатора: +375 (33) 696-17-16 с 10:00 до 16:00 в рабочие дни, по адресу электронной почты: visa@yaskrava.by, а также на Интернет-сайте ЗАО Банк ВТБ (Беларусь): <u>www.vtb.by</u>.

*Свидетельство о государственной регистрации Рекламной игры № 4085 выдано 12.10.2021 г. Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

14 КАСТРЫЧНІКА 2021 г.
ЧАЦВЕР
№ 19 (15918)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


*Будзем знаёмыя*

## Сцюша ТАЙМ:

# «Самае галоўнае — трэба быць актыўнымі»

**Гэта дзяўчына ў мінулым годзе ўзарвала інтэрнэт-прастору гучнымі прызнаннямі ў любові да роднай Беларусі, Дзяржаўнага сцяга і Прэзідэнта. Яна была адной з нямногіх, хто адкрыта заявіў у сацсетках пра сваю катэгарычную пазіцыю, не пабаяўшыся хейтараў і лавіны агрэсіі. У сваіх відэароліках на TikTok і YouTube Сцюша Тайм падтрымлівае палітыку Прэзідэнта і прадстаўляецца падпісчыкам як беларускі блогер і патрыёт сваёй краіны.**

***— Сцюша — гэта імя ці псеўданім?***

— Псеўданім. Я прыдумала яго два гады таму. Сцюша — памяншальна-ласкальнае ад Насці, у дзяцінстве мяне так называлі сябры і родныя. Насцяў шмат у інтэрнэце, а Сцюш — паменей *(смяецца)*. «Тайм» у перакладзе з англійскай «час», які можна карысна правесці са мной. А яшчэ я пастаянна спазняюся. Спадзявалася, што, калі сябе так назаву, буду мега-пунктуальнай, але пакуль што гэта не дапамагае *(смяецца)*, бо шмат усялякіх спраў, усюды спяшаюся.

***— Вы працуеце на СТБ, аднак па прафесіі стаматолаг. Як апынуліся на тэлеканале?***

— Скончыла Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт у 2012 годзе, у жодзінскай паліклініцы была адпрацоўка, пасля ў 4-й гарадской паліклініцы Мінска працавала стаматолагам. Я не планавала стаць карэспандэнтам, проста два гады таму вырашыла памяняць занятак, зарэгістравалася ў дзіцячым дадатку Likee (адна з самых папулярных глабальных платформаў для стварэння і публікацыі арыгінальных відэа. — **Аўт.**), пачала весці каналы на YouTube. Стала афіцыйнай вядучай у гэтым інтэрнэт-дадатку, трэба было праводзіць трансляцыі 30 гадзін у месяц. Пасля здарыўся жнівень 2020-га. Я не змагла змаўчаць, бачыла, што адбываецца, хацелася сказаць і свае слова. У мяне маці і бацька педагогі, былі ў выбарчай камісіі. Пачаўся жахлівы хейт, пагрозы. Тады сказала бацькам: «Не перажывайце, я профі, год у інтэрнэце», і пачала запісваць ролікі.

І пайшло-паехала... І вось аднойчы ў «Фэйсбуку» дырэктар СТБ Кірыл Казакоў (на той час ён яшчэ не быў дырэктарам) прапанаваў весці рубрыку на беларускім тэлеканале. Так я апынулася на СТБ. Цяпер працую на палову стаўкі карэспандэнтам.

***— Не шкадуеце, што аднойчы кардынальна змянілі прафесію?***

— Разумею, што я, мабыць, не дацягваю ў плане журналістыкі, але хачу развівацца ў гэтым кірунку. З задавальненнем еду на працу, ад душы раблю сваю справу. У мяне два каналы на YouTube, люблю здымаць відэаролікі. Цяжка, вядома, складаней, чым у стаматалогіі: там адпрацаваў змену, прыйшоў дамоў і адпачываеш. А тут 24 гадзіны ў суткі думаю, як зняць, як расказаць. Няма выхадных, ты заўсёды ў думках.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*



*Мазгавы штурм*

# АД КУХНІ ПРОДКАЎ ДА «ЖЫВОЙ СЦЯНЫ» Ў КЛАСЕ

## І «Твітэр» — для школьнага сачынення

**Якія ёсць спосабы для вывучэння гісторыі? Праз кнігі, наведванне музеяў і славутасцяў... «Але ёсць яшчэ адзін, які па-сапраўднаму дае адчуць сувязь з продкамі, — упэўнена выпускніца Дзеркаўшчынскай сярэдняй школы, студэнтка Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава Настасся ДОМНІЧ. — Гісторыя — гэта не толькі войны і перамір'і, але і звычайнае штодзённае жыццё, а ежа — яе частка. Таму, каб дакрануцца да жыцця нашых продкаў, можна гатаваць тыя стравы, якія былі на іх стале. Для мяне такім спосабам яднання з мінулым стаў хлеб. Не той, што робяць на заводзе, а той, чый рэцэпт перадаецца з пакалення ў пакаленне».**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*




**Настасся Домніч: «А чаму б не вывучаць гісторыю па смаку?»**

*Свой ракурс*

# УБАЧЫЦЬ ПРЫГАЖОСЦЬ ПРАЗ АБ'ЕКТЫЎ З ВЫШЫНІ

**25-гадовы мінчанін Арцём УСЦІНАЎ па адукацыі географ, у мінулым годзе скончыў факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ. Але па стане душы хлопец... фатограф. Гэтым майстэрствам захоплены з дзяцінства, аднак паглыбіўся ў яго пяць гадоў таму. Зараз у скарбонцы суразмоўніка больш за дзесяць тысяч здымкаў, каля тысячы з якіх зроблены з вышыні дахаў шматпавярховікаў розных гарадоў Беларусі, а таксама іншых краін.**



— Прага да фатаграфіі ў мяне была заўсёды. У падлеткавым узросце браў свой старэнькі Sony Ericsson і ішоў здымаць захад сонца ў сябе за домам. Тады яшчэ не думаў, што некалі з такога хобі атрымаецца штосьці сур'ёзнае, рабіў гэта толькі для сябе. Аднойчы гартаў стужку ў Instagram, убачыў фатаграфію, зробленую з даху на Нямізе, падумаў, што гэта вельмі цікава, бо так адкрываецца незвычайны від на Мінск. У хуткім часе ўбачыў яшчэ адзін здымак — з вежаў «Брамы Мінска», тады па-сапраўднаму задумаўся над тым, каб паспрабаваць зняць нешта падобнае. Але было відавочна: мабільны не падыдзе для таго, каб удала зрабіць патрэбны кадр, таму браў бацькоўскую «мыльніцу». Праз некаторы час мяне прызвалі ў армію, ужо там задумваўся над тым, каб набыць уласны прафесійны фотаапарат. Вярнуўся да цывільнага жыцця — ажыццявіў жаданне, гэта натхніла на творчасць і з таго часу штодзень удасканальваю майстэрства. Ніякіх спецыялізаваных курсаў не заканчваў, наогул лічу, што яны не паказчык прафесійнага навыку.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
14 10 2021 г.

# АД КУХНІ ПРОДКАЎ ДА «ЖЫВОЙ СЦЯНЫ» Ў КЛАСЕ

## АД ЭКАЛОГІІ ДА УРБАНІСТЫКІ

Настасся Домніч і яшчэ дзевяць старшакласнікаў і выпускнікоў беларускіх школ сталі ўдзельнікамі фіналу праекта «Першыя» і выйшлі ў знакаміты чырвоны круг інтэлектуальнай маладзёжнай канферэнцыі TEDxYouth@Minsk. Па традыцыі прамовы ўсіх спікераў гучалі па-беларуску, бо адна з мэт «Першых» — пашырэнне выкарыстання беларускай мовы.

«Першыя» — гэта конкурс яскравых ідэй пакалення Z, які быў абвешчаны ў лютым гэтага года для вучняў 9-х, 10-х і 11-х класаў. Трэба заўважыць, што ў трэцім сезоне да праекта далучыліся не толькі навучэнцы школ, але і выхаванцы ўстаноў дадатковай адукацыі, у якіх дзейнічаюць экалагічныя аб'яднанні па інтарэсах. Менавіта кірунак «Экалогія» стаў самым папулярным сярод удзельнікаў. Традыцыйна шмат заявак прыйшло па тэмах «Культура», «Інклюзія» і «Тэхналогіі», але і да новага тэматычнага кірунку «Урбаністыка» старшакласнікі таксама праявілі вялікую цікавасць. Кожнай з тэм былі прысвечаны асобныя майстар-класы і мітапы з экспертамі, падчас якіх удзельнікі праекта маглі распрацоўваць сваю ідэю, набываць карысныя веды, развіваць навыкі выступленняў і каманднай працы.

Усяго на конкурс было пададзена больш за 100 відэа з прэзентацыямі ідэй, якія можна знайсці па хэштэгу #generationA1 у сацыяльных сетках TikTok, VK, YouTube, FB, OK, Twitter і Instagram. Журы выбрала ў маі аўтараў дзесяці найцікавейшых, і ўсё лета яны рыхтавалі свае выступленні.

## ХЛЕБ АД БАБУЛІ СЦЕПАНІДЫ

— Віцебская вобласць, Глыбоцкі раён, вёска Дзеркаўшчына. Менавіта тут я пакаштавала самы смачны хлеб — хлеб ад Сцепаніды Лупач, які занесены ў спіс нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Калі пазнаёмілася з ёй, яшчэ не разумела, які неверагодны перада мной чалавек, — прызнаецца Настасся Домніч. — Сцепаніда Аляксандраўна на той момант працавала ў клубе-бібліятэцы. Да гэтага была прадаўцом, касірам, але менавіта культура прыносіла ёй сапраўдную асалоду. Яна ладзіла святы вёсак, абрадавыя гульні, розныя выстаўкі і конкурсы. Я, яшчэ маленькая дзяўчынка, прымала ўдзел у канцэртах, якія праводзіла бабуля Сцепаніда. Добра памятаю, як пасля чарговага выступлення яна паклікала нас пакаштаваць свой хлеб. Гэта была асалода з першага да апошняга кавалачка. Пазней мне пашчасціла выпякаць хлеб разам з ёй. Гэта вельмі душэўны працэс, бо нельга распачынаць пячы хлеб, калі ты ў дрэнным настроі. А яшчэ працэс вельмі складаны, бо патрабуе шмат увагі і цярпення, працэс у пэўнай ступені сакрэтны, бо свае сакрэты ёсць у кожнай гаспадыні. Раней я спрабавала выпякаць хлеб, рэцэпт якога знайшла ў інтэрнэце, але атрымалася зусім не тое, што хацела. Шмат залежыць ад рошчыны...

Дакладна сказаць, якія віды дражджэй і бактэрый жывуць у дзежцы Сцепаніды Аляксандраўны, нельга без спецыяльнага аналізу, а яго пакуль ніхто не рабіў. Але не толькі гэта не дазваляе паўтарыць хлеб з Дзеркаўшчыны. Справа ў тым, што дакладнага рэцэпта, дзе было б распісана ў грамах, не існуе. Усё робіцца «на вока», а вока ў бабулі Сцепаніды як алмаз, таму, каб захаваць рэцэпт, трэба яго вывучаць на практыцы і перадаваць далей — так, як гэта адбывалася на працягу стагоддзяў. Сцепаніду Аляксандраўну выпякаць хлеб навучыла яе маці, тую — яе маці і гэтак далей. Імёны гублюцца ў гісторыі, а рэцэпт застаецца. За дзвесце, а можа, і больш гадоў гэта тэхналогія не зведала змен, і мне пашчасціла да яе дакрануцца.

«А чаму б не зрабіць так, каб такая магчымасць была і ў іншых, — ставіць пытанне Настасся Домніч. — На ўроках мы вывучаем гісторыю па тэкстах, малюнках, схемах. А чаму б не вывучаць яе таксама па смаку? Зараз мы працуем над тым, каб у Дзеркаўшчыне з'явілася школьная міні-пякарня «У гасцях у бабулі Сцепаніды». Там будуць выпякаць хлеб па той самай унікальнай рэцэптуры, і вучні змогуць даведацца, што елі іх продкі шмат гадоў таму. Такія ўрокі дакладна запомняцца надоўга. Да хлеба заўсёды было асаблівае стаўленне, напрыклад, у нашых продкаў была забарона выпраўляцца ў дарогу без хлеба, бо ён гарантаваў выжыванне. Калі хлеб ставілі ў печ, то ўсе з печы павінны былі ў гэты момант злезці. Нават хлебную крошку вельмі шанавалі, ні ў якім разе яна не павінна была ўпасці на падлогу. Рэшткі хлеба ніколі не аддавалі хатнім жывёлам. Пра ўсё гэта будуць распавядаць у нашай міні-пякарні. І я ўпэўнена, што гэта спрацуе. А калі вучні паспрабуюць зрабіць хлеб ад бабулі Сцепаніды, можа, ім захочацца спытаць і ў сваіх бабуль пра стравы іх дзяцінства. І мы станем сведкамі адраджэння сямейных кулінарных традыцый. Што датычыцца мяне, то гэты хлеб ужо стаў чымсьці асаблівым. І калі ў мяне з'явяцца дзеці, я вельмі хацела б паклікаць іх на кухню разам гатаваць хлеб бабулі Сцепаніды. Потым яны паклічуць сваіх дзяцей, і гэта стане нашай сямейнай традыцыяй. Гэта неверагоднае адчуванне, калі ты паўтараеш тыя ж рухі, што паўтаралі да цябе і 50, і 100 гадоў таму. У такія моманты па-сапраўднаму адчуваеш сувязь з продкамі праз вось такія простыя, але вельмі важныя рэчы.

## ДУМКА Ў 140 ЗНАКАХ

Сваім «рэцэптам» таго, як можна зацікавіць дзяцей чытаннем, падзяліўся ў чырвоным крузе TEDxYouth@Minsk **выпускнік сярэдняй школы № 22 Барысава, цяпер першакурснік БДТУ Дзмітрый ГРЫБОЎСКІ**.

— Пачынаюцца летнія канікулы, у школьнікаў — мільёны планаў, як іх правесці, а тут — велізарны спіс літаратуры, і яго трэба прачытаць без тлумачэнняў — проста трэба! Ды яшчэ і ціск з боку бацькоў. І ўсё гэта выклікае натуральны пратэст з боку падлеткаў, — разважае юнак. — Але калі моладзь аддае перавагу экранам гаджэта, дык чаму не прыйсці да іх з літаратурай праз гэтыя самы экран?

А натхнілі Дзмітрыя акцёры Каралеўскага шэкспіраўскага тэатра, якія, каб прыцягнуць увагу да пастановак «Рамэа і Джульета», на працягу некалькіх тыдняў абменьваліся на сайце паведамленнямі паміж сабой і іншымі наведвальнікамі. Віртуальныя Рамэа і Джульета не пераказвалі змест п'есы, а разважалі на розныя актуальныя тэмы, пры гэтым прытрымліваючыся сюжэтнай лініі твора, інтрыгавалі. Нядзіўна, што захацелася звярнуцца да першакрыніцы, каб зразумець, а што ж у іх адбылося там насамрэч. Прычым без усялякага прымусу....

— Трэба зацікавіць, паказаць сувязь з сённяшнім днём, а не прымушаць. Ведаеце, я люблю пісаць сачыненні, але вельмі не люблю, калі трэба напісаць тэкст на пэўную колькасць старонак, — канстатуе хлопец. — А чаму б не выкарыстоўваць для гэтых мэт хоць час ад часу «Твітэр». Там усе свае думкі трэба ўкласці ў 140 знакаў. Гэта не прасцей, наадварот — выказаць думкі сцісла, дакладна і прос-та значна складаней, чым на пяці лістах паўтараць агульныя фразы. «Твітэр» падштурхоўвае вас да яшчэ большай крэатыўнасці, таму што вы ведаеце, што абмежаваныя пэўным лімітам слоў для выказвання сваіх ідэй і эмоцый.




Дзмітрый Грыбоўскі: «Выказаць думкі сцісла, дакладна і проста — значна складаней. «Твітэр» падштурхоўвае да яшчэ большай крэатыўнасці...»

У якасці прыкладу Дзмітрый Грыбоўскі прывёў сацыяльную сетку LiveLib (адзін з самых папулярных парталаў рунэту ў галіне літаратуры. — **Аўт.**), карыстальнікі якой запусцілі флэшмоб: яны пераказваюць вядомыя творы ў тых самых 140 знаках. Напрыклад, казка пра Калабка — гэта твор пра тое, як чарада не звязаных паміж сабой падзей прыводзіць да недарэчнай смерці галоўнага героя.

«Вы чулі, маёнтак з садам прададуць. Ды што вы кажаце — маёнтак з садам прадаюць? Ах, шкада, маёнтак з садам прададзі», — інтэрпрэтацыя п'есы Антона Чэхава «Вішнёвы сад».




Іван Пухоўскі: «Навучэнцы ў прысутнасці раслін засвойваюць на 20 працэнтаў больш інфармацыі».

На прапанову вядучага канферэнцыі пераказаць у 140 знаках любімы твор Дзмітрыя «80 дзён вакол свету» Жуля Верна фіналіст не разгубіўся і хуценька адказаў: «Гэта кніга аб перавагах бязвізавага рэжыму».

— Я вельмі люблю рэбусы і галаваломкі, яны даюць прастору нашай фантазіі, развіваюць творчасць і крэатыўнасць, — кажа Дзмітрый Грыбоўскі. — І «Твітэр» для гэтых мэт падыходзіць ідэальна. Напрыклад, мы пішам кароткую гісторыю, пры гэтым прапускаем асобныя словы. Затым прапануем нашым чытачам і падпісчыкам самім запоўніць прабелы. Атрымліваецца мноства розных гісторый, пры гэтым кожны становіцца суаўтарам. А яшчэ ёсць TikTok, Instagram і YouTube.

Часта там трапляюцца відэа з урыўкамі з фільмаў з самымі цікавымі момантамі, якія прымушаюць паглядзець стужку цалкам. Дык чаму б не зрабіць аналагічнае з літаратурай? Адзін з самых сучасных спосабаў яе папулярызацыі — гэта буктрэйлеры, кароткія ролікі па матывах кнігі. Фактычна гэта рэклама кнігі, таму буктрэйлеры падпарадкоўваюцца асноўным законам рэкламы: ролік павінен быць кароткім, запамінальным і, галоўнае, у ім павінна быць інтрыга.

Дзякуючы такім ролікам, шмат новых падпісчыкаў і чытачоў могуць атрымаць аўтары класічнай літаратуры, і ўжо атрымліваюць. У хэштэга #кніжныТітTok — 350 мільёнаў праглядаў, #літаратурныТікTok — 101 мільён. Крэатыўныя хлопцы і дзяўчаты здымаюць кароткія відэа пра кнігі, інтрыгуючы кніжнымі навінкамі і прапануюць адгадаць вядомыя творы па першых радках. Усё гэта з гумарам, ironіяй і любоўю да літаратуры! Глядзіш іх, і рука сама цягнецца да кнігі, і не трэба прымушаць. Чытаеш, таму што бачыш, — гэта не стос старых кніг, а тое, што выклікае рэакцыю ў тваіх аднагодкаў, тое, што можна абмяркоўваць, на аснове чаго можна крэатывіць. І ты чытаеш, таму што бачыш сувязь з кнігай, з героямі і з іншымі чытачамі.

## ЗЯЛЁНЫ МАТЫВАТАР

«Што вы ўяўляеце пры згадванні крэатыўнай прасторы? — пацікавіўся ва ўдзельнікаў канферэнцыі **навучэнец сярэдняй школы № 2 з Чэрыкава Іван ПУХОЎСКІ**. — Калі мы гаворым, што школа павінна развіваць крэатыўнасць, то гэта павінна адбывацца ў крэатыўнай прасторы. А што можа зрабіць прастору камфортнай і адначасова крэатыўнай? Расліны і кветкі... Вы скажаце, што такі варыянт не можа штосьці глабальна змяніць. Дык давайце паспрабуем узяць не адну, а некалькі раслін і размясціць іх не гарызантальна, а вертыкальна. Так мы атрымаем «жывую сцяну». Канструкцыю з жывымі раслінамі можна лёгка перавозіць з аднаго кабінета ў іншы, і яна эканоміць прастору ў памяшканні. Давайце прыгадаем, што мы адчуваем, калі знаходзімся на чыстым паветры? Такога ж эфекту можна дабіцца ў памяшканні з дапамогай раслін, якія зніжаюць утрыманне вуглякіслага газу на 20—30 працэнтаў. Было праведзена мноства даследаванняў, якія сведчаць, што навучэнцы ў прысутнасці раслін засвойваюць на 20 працэнтаў больш інфармацыі. Такая вялікае даследаванне было праведзена прафесарам тэхналагічнага ўніверсітэта з Тайваня, які вывучаў эмацыянальны, псіхічны стан, здароўе і паспяховасць вучняў у двух класах. У адным з пакояў ён паставіў шэсць невялічкіх дрэў. Праз пэўны час пераканаўся, што ў класе з раслінамі вучні менш хварэлі, лепш пісалі тэсты і адчувалі сябе больш камфортна».

Іван Пухоўскі вырашыў правесці сваё інтэрнэт-апытанне, якое ахапіла больш як 500 беларускіх школьнікаў. На пытанне, наколькі вам камфортна вучыцца ў кабінетах вашай школы, 39 працэнтаў адказалі «нешта сярэдняе», 6 працэнтаў — «горш за сярэдняе» і 1 працэнт — «жахліва». Больш як чвэрць апытаных паведамілі, што ў іх кабінетах мала раслін або іх увогуле няма. Пры гэтым 95 працэнтаў навучэнцаў упэўнены ў тым, што расліны могуць уплываць на здароўе чалавека і 82 працэнты ўпэўнены, што ад іх наяўнасці залежыць і эмацыянальны стан чалавека.

«Такім чынам, і навука кажа — карысна, і вучні кажуць, што ім не хапае раслін», — падсумоўвае Іван і прапаноўвае розныя спосабы выкарыстання «жывой сцяны» ў школах. Адзін з самых простых — на ўроках біялогіі пры напісанні практычных і лабараторных работ. Ці, напрыклад, у STEM-класах пры вывучэнні праграмавання. STEAM-падыход заснаваны на спалучэнні мастацтва, матэматыкі і інжынерыі. Няхай навучэнцы самі распрацоўваюць аўтапаліў для «жывой сцяны», устанаўліваюць фіталямпы, праграмуюць іх. «Такім чынам мы вырашаем праблему не толькі з камфортам, але і адначасова з навучаннем, — разважае Іван. — Дамагаючыся экалагічнага мыслення, ствараймя экалагічную прастору. Хочаш высокіх вынікаў навучання — ствараймя камфортную прастору, імкнешся развіваць крэатыўнасць — ствараймя крэатыўную прастору».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота прадастаўлена арганізатарамі.**

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

# УБАЧЫЦЬ ПРЫГАЖОСЦЬ ПРАЗ АБ'ЕКТЫЎ З ВЫШЫНІ



*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

У сям'і Арцёма абодва дзядулі былі таксама фатографамі. «Дзед Барыс быў ваенным і займаўся аэрафотаздымкай: у складзе падраздзялення падымаўся на самалёце, рабіў здымкі мясцовасці, потым праяўляў кадры. Дарэчы, ён сфатаграфаваў Юрыя Гагарына, які толькі вярнуўся з палёту ў космас 12 красавіка. Я, дарэчы, нарадзіўся ў гэты дзень. Зараз унікальны здымак знаходзіцца ў нашым сямейным архіве. Другі дзядуля Мікалай таксама быў захоплены фатаграфіяй на аматарскім узроўні», — расказвае суразмоўнік.

Усе лакацыі ён знаходзіць самастойна, прагульваючыся па горадзе або заўважыўшы нешта цікавае ў сацсетках. Знаходзіць іх лёгка, бо Арцём вельмі добра арыентуецца па картах. Ён кажа, што некаторыя кадры атрымліваецца зрабіць спантанна: бачыш крутую кампазіцыю, дастаеш фотаапарат — і гатова. Але бываюць моманты, калі трэба прыйсці на нейкае месца не раз, чакаць шмат часу, каб застацца задаволеным сваёй работай.

— Рэагую на гэта спакойна. Куды спяшацца, можна прыйсці праз дзень або месяц і зрабіць насамрэч круты кадр. Аднойчы хацеў «злавіць» прыгожы заход сонца на вуліцы Прытыцкага, адной з самых ажыўленых у Мінску: з дапамогай пэўнага рэсурсу высветліў, у які з дзён яно будзе сядзіцца менавіта над дарогай, і кожныя паўгода прыходзіў туды. А там то хмары, то дождж, то занадта яркае сонца... І вось нарэшце сёлета праз два з паловай гады, у сакавіку, усё склалася, — адчуў ад гэтага вялікую асалоду. Увогуле, кадры раблю ў першую чаргу для сябе, не чакаю ацэнкі ад іншых, але, вядома, мне прыемна, калі ёсць зваротная сувязь. За ўсе гады, што займаюся фатаграфіяй, я пазнаёміўся з дастатковай колькасцю таленавітых людзей, абменьваемся з імі вопытам, дзелімся парадамі, але ў асноўным спадзяюся толькі на сябе. Родныя мяне заўсёды падтрымлівалі. Бабуля сочыць у сацсетках, ганарыцца. Крытыку таксама заўсёды гатовы выслухаць, гэта нармальна, калі не ўсім і не заўсёды ўсё падабаецца.

Асноўным аб'ектам фотаздымкі для Арцёма цяпер з'яўляюцца дахі шматпавярховікаў, трапіць на якія можна двума спосабамі: з дазволу адпаведных службаў або наведваць тыя, што знаходзяцца ў адкрытым доступе.

— Падымаюся на самыя высокія кропкі горада дзеля таго, каб «злавіць» тое, што немагчыма ўбачыць з узроўню зямлі. Апошні варыянт здаецца мне банальным, а прагулкі па дахах даюць пазітыўныя эмоцыі. Сам я ўжо прывык да вышыні, але ўсё ж такі не падыходжу блізка да краю. Рэдка, але ўзнікалі моманты, калі жыхары ставіліся з недаверам: пыталіся, хто я, навошта тут і іншае. Але пасля спакойнай гутаркі звычайна знаходзілі кампраміс. Бывала, што некаторыя мінакі падымаліся разам са мною, каб проста палюбавацца горадам з нетыповага ракурсу. Калі ўваход на дах зачынены, а вам туды вельмі хочацца, лепш узгадніць гэты момант з прадстаўнікамі мясцовай улады. Самая вялікая вышыня, якую я пакарыў разам са сваім фотаапаратам, — 60 паверхаў хмарачоса (або 213 метраў!), было гэта пяць гадоў таму ў Маскве. Нічога падобнага дагэтуль са мной не здаралася, у імгненне з'явілася пачуццё эйфарыі. У Беларусі таксама ёсць некалькі любімых месцаў. Напрыклад, у раёне Сухарава на дах аднаго з будынкаў я падымаўся больш чым 150 разоў. Часам прыходзіў не толькі каб фатаграфаваць, але і проста паглядзець на заход сонца або світанак, адпачыць. Гэта месца выклікае ў мяне самыя цёплыя ўспаміны.

Арцём адзначае, што на якім-небудзь даху ён можа прабыць і гадзіну, і нават дзевяць!

— Гэта было ў раёне Каменнай Горкі. Тады ў Мінск з розных куткоў краіны прыехалі мастакі, каб намаляваць муралы на сценах жылых дамоў. Трэба было зняць таймлапс — запаволеную здымку — таго, як яны працуюць. Наша каманда завітала туды недзе ў дзевяць гадзін раніцы, а вярнуліся дадому, калі ўжо была цемра. Дарэчы, выпадкова пазнаёміўся з дзяўчынай, гераіняй малюнка «Лічбавы Свет», што з галактыкай у руцэ. Яна мне напісала, прапанавала схадзіць пафатаграфавацца на дах, а я ў сваю чаргу захацеў рэалізаваць з ёй адну творчую ідэю. На гэта сышло каля 15 гадзін. Увогуле, важную ролю мае апрацоўка здымкаў, на яе магу адвесці як 15 хвілін, так і пяць гадзін. Яна дае пэўны настрой, робіць кадры яркімі, індывідуальнымі. Ёсць тыя, за якія магу ўзяцца толькі праз год-два. З'яўляюцца новыя веды, і за кошт апрацоўкі фота выглядае па-іншаму. Дарэчы, заўсёды памятаю, дзе і пры якіх абставінах была зроблена фатаграфія, бо ўклаў у кожную часцінку сябе.

У Арцёма ёсць спіс месцаў, якія б ён хацеў наведаць, каб зрабіць там прыгожыя кадры:

— Дакладней, пажаданых лакацый, куды варта прыехаць у пэўны час, дзень. Увогуле, аб'ездзіў усе абласныя цэнтры, стараюся знаходзіць цікавыя аб'екты тут. Вельмі спадабалася ў Гродне, Віцебску, Пінску, Маладзечне, Баранавічах, Бабруйску. Ёсць і пэўныя гарады ў іншых краінах, дзе я хацеў бы паздымаць. Напрыклад, з'ездзіць у Ганконг, Шанхай, Франкфурт, Нью-Ёрк, бо вельмі люблю хмарачосы. З нядаўніх часоў стаў захапляцца здымкай таймлапсаў. Гэта цяжэй, чым рабіць статычныя кадры. Нешта здымаю штодзень, многія з маіх знаёмых, з кім пачыналі займацца такой дзейнасцю разам, ужо «перагарэлі». А я дакладна разумею, што фатаграфія — маё прызванне. Пакуль што на пастаяннай аснове ёй не зарабляю, іншым часам бяру камерцыйныя праекты, здымаю тых, каму падабаецца мой стыль, аднак імкнуся да таго, каб гэта стала маёй асноўнай дзейнасцю. А для гэтага патрэбен час.

**Фота дадзена героем публікацыі.**

*Камертон настрою*

# НА РОДНАЙ МОВЕ ПРА ГІСТОРЫЮ

## ТОЛЬКІ ТАК МОЖНА ЗРАЗУМЕЦЬ, ШТО ТАКОЕ БЕЛАРУСЬ

**Сярод нас многа цікавых, таленавітых, крэатыўных маладых людзей, і з адным з іх мы вас зараз пазнаёмім. Выпускнік спецыяльнасці «Гісторыя. Айчынная і ўсеагульная» гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Юрый ТАМКОВІЧ з маленства захапляецца гэтай навукай. Хлопец праводзіць экскурсіі па Мінску, здымаецца ў краязнаўчых відэароліках на YouTube-каналах, прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці сваёй навучальнай установы, мае нямала аднадумцаў.**

— Першая тэматыка, якой я зацікавіўся яшчэ ў малодшых класах гімназіі, ваенная: чытаў адпаведную літаратуру, глядзеў фільмы. Да таго ж удзельнічаў у алімпіядах па гісторыі, два разы займаў першыя месцы на рэспубліканскім узроўні. Пасля вучыўся ў Ліцэі БДУ, там была вельмі добрая атмасфера, з'явіліся сябры, якія падзялялі мае захапленні. Наш клас быў гістарычнага профілю, таму з аднакласнікамі было цікава пагаварыць пра гісторыю, часам разам падарожнічалі па Беларусі. А паступленне на гістарычны факультэт БДУ стала штуршком для яшчэ большага самаразвіцця. Удзельнічаў у шматлікіх праектах, публікаваў свае матэрыялы на інтэрнэт-партале, які стварыла адна з выкладчыц нашага факультэта. Браў інтэрв'ю ў вядомых асоб нашай краіны: пісьменнікі, мастакі, артысты, акцёры... Таксама пісаў пра свае ўражанні ад вандровак па розных мясцінах Радзімы.

З пачатку пандэміі многія беларусы сталі падарожнічаць па нашай краіне. Юра кажа, што яго сябры і знаёмыя таксама актыўна пыталіся ў яго, куды лепш з'ездзіць і што паглядзець у Беларусі. «Сам я хацеў бы ў найбліжэйшым часе з'ездзіць на Палессе, да Прыпяці», — канстатуе ён.

Суразмоўнік расказаў, што яго вельмі хвалююць пытанні, звязаныя з гісторыка-культурнай спадчынай Беларусі... «Я шмат падарожнічаю і бачу, у якім стане культурныя аб'екты. Так, многае было адноўлена за час незалежнасці Беларусі, той жа Нясвіжскі і Мірскі замкі, але разам з тым ёсць храмы, сядзібы, старыя некропалі, якія дагэтуль маюць не вельмі прывабны выгляд, — іх можна лёгка страціць, калі не ўдзяляць ім увагі», — кажа ён.

Хлопец вядзе рубрыку на YouTube-канале свайго сябра, дзе расказвае цікавыя гісторыі, маласвядомыя факты аб сталіцы нашай краіны. «Прыемна, што ёсць зваротная сувязь у каментарыях, гледачы хочуць бачыць мяне там часцей. Але сам не планую ствараць уласны канал, бо пакуль няма часу і жадання ў гэтым разбірацца».

А яшчэ Юра часта размаўляе на роднай мове.



— Пачаў вывучаць яе па гістарычных кнігах у гімназіі, шукаў цікавыя суполнасці, групы, пляцоўкі па інтарэсах, дзе можна папрактыкавацца размаўляць па-беларуску. А калі паступіў у Ліцэй БДУ, адчуў, што там усе вельмі любяць нашу мову і актыўна выкарыстоўваюць яе. Менавіта тады дакладна зразумеў, што буду паступаць на беларускамоўнае аддзяленне гістарычнага факультэта БДУ.

Каб паглыбіцца ў гісторыю, суразмоўнік раіць школьнікам паглядзець фільм «Выратаваць радавога Райна» Стывена Спілберга, «Трою» Вольфганга Петэрсена, «Брэсцкую крэпасць» Аляксандра Ката. «З беларускай літаратуры абавязковыя да прачытання Васіль Быкаў, напрыклад, яго аўтабіяграфія «Доўгая дарога дадому», аповесць «Сотнікаў» і іншыя. А таксама вершы Янкі Купалы. Быкаў і Купала — два слупы, па якіх можна зразумець, што такое Беларусь».



Зараз Юра займаецца праектам «Памяць і слава», прымеркаваным да 100-годдзя БДУ, фільмы ў рамках якога ўжо змешчаны на YouTube-канале гістарычнага факультэта:

— Я вядучы праекта. Праводжу экскурсіі па Вайсковых могілках Мінска, расказваю пра знакамітых дзеячаў БДУ, якія там пахаваны. З цягам часу праектператварыўся ў цэлы рух — за год мы прыбралі 30 пахаванняў універсітэцкіх выкладчыкаў на розных могілках Мінска. Таксама рыхтую інтэрактыўную карту па міжваенным БДУ — езджу ў архівы і бібліятэкі, дзе збіраю інфармацыю. Адным словам, актыўна ўдзельнічаю ў падрыхтоўцы да святкавання стагоддзя сваёй альма-матар. Я паступіў у магістратуру, потым, магчыма, пайду ў аспірантуру. Хачу займацца навуковай дзейнасцю.

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Дар'я ШЛАПАКОВА.**

SEX=БАЛЯСЫ

# ЖАХ ЖАХЛІВЫ!

**І сёння зноў пра сучасную моду і новыя трэнды ў ёй... («— Калі ласка, заходзьце ў нашу краму! Чым я магу вам дапамагчы?» — «Адпужвайце ад мяне іншых кансультантаў».) Але пачну крыху здалёк. У дзяцінстве ў нашай вулічнай кампаніі быў Віталік. Толькі па імені яго ніхто не называў, а толькі па мянушцы — Француз. Справа ў тым, што ён вельмі любіў прыманіць, нават калі карысці ад гэтага не было ніякай. І вось аднойчы сказаў, што ў яго французскія красоўкі. Вядома, гэты было не так, хлопца ўзялі на смех, і ён атрымаў пажыццёвую мянушку. («Пад акном дзеці мірна гуляюць з хлопчыкам па імені Цярэнцій. У добры час ты нарадзіўся, Цярэнцій, падчас майго дзяцінства з такім імем ты б далей пад'езда не выйшаў».) Нагодай для яе магло стаць і не «тое» адзенне, якое нармальныя «пацаны» не павінны былі насіць. Таму зараз я часам гляджу на сённяшніх моднікаў і з жахам думаю, што было б, каб яны апынуліся ў мінулым. («Коратка пра сучасную моду: 1. Рваныя джынсы на каленях. 2. Трэснутыя экраны на гаджэтах».) Але мерапрыемствы кшталту Тыдня моды ў Нью-Ёрку і Лондане — гэта ўвогуле ў маім уяўленні жах жахлівы! («Калі ў вас з'яўляецца спакойная хвілінка без трывог, клопатаў, непрыемнасцяў, не цешце сябе ілюзіямі. Жыццё проста перазараджае стрэльбу».) Нядаўна дызайнеры з усяго свету прадставілі свае калекцыі сезона вясна — лета 2022.**

Адным з галоўных трэндаў шоу сталі агаляючыя цела ўборы. («Лена была згодная, каб бабулі каля пад'езда лічылі яе жанчынай з нізкай сацыяльнай адказнасцю, абы толькі не даведаліся, што яна — тэрапеўт».) У сутычцы за ўвагу гледачоў мадэльеры выпускалі на подыум дзяўчат топлес або ў напаўпразрыстых сукенках, а юнакоў — у купальніках і туфлях на абцасах. Так, хайлайтам мерапрыемства ў Лондане стаў паказ Эдварда Кратчлі, падчас якога мужчыны дэфілíравалі ў злітных купальных касцюмах з дэкальтэ і мноствам масіўных упрыгожванняў. («Як сфоткацца на агародзе, каб усе падумалі, што я на моры?»)



У эпоху поўнага размыцця межаў гендарнай моды яшчэ адну тэндэнцыю на вуліцах і подыумах прадставілі маладыя людзі ў традыцыйна жаночай вопратцы. («— Цікава, а як пачынаецца новы трэнд у модзе?» — «Спачатку пра яго пачынаюць трындзець...») Пышныя сукенкі ружовых адценняў, батфорты на платформе, стракатыя парыкі і сумкі-клатчы сталі запатрабаванымі (???) прадметамі гардэроба ў мужчынскай паловы гасцей. Вось такія метамарфозы сучаснай фэшн-індустрыі. («Калі ваша жыццё — «пятая кропка», купіце ёй хоць бы прыгожыя трусы».) Так, амерыканскі рэпер Kid Cudi не прапускае магчымасці прадэманстраваць сваю любоў да спадніц. Напрыклад, у красавіку ён выступіў на шоу Saturday Night Live ў жаночай сукенцы ў кветачку, а на штогадовым балі Met Gala артыст паўстаў перад фатографамі ў блакітным швэдры і доўгай спадніцы з празрыстай тканіны. Паказ калекцыі вясна — лета 2022 маркі Studio 189 не стаў выключэннем: рэпер з'явіўся ў пышнай вячэрняй спадніцы ў спалучэнні з паўсядзённым лангслівам. («Лепш краўчыхі без спадніц, чым шаўцы без ботаў».)

На Тыдні моды ў Нью-Ёрку даўжыня кроп-топаў выйшла на новы ўзровень: амерыканская рэперша Брытані Колінз, вядомая пад псеўданімам Coi Leray, з'явілася на вуліцах горада з літаральна аголенымі грудзьмі. Выканаўца наведала паказ у новай версіі класічнага касцюма з аплікацыямі на інтымных участках цела. («Мая дзяўчына выглядае настолькі прыгажэйшай за мяне, што касіры ў крамах раздзяляюць нашы пакупкі».)

Калі калекцыя твайго адзення на Тыдні моды ў Нью-Ёрку не адрозніваецца арыгінальнасцю, у ход ідуць дзіўныя галаўныя ўборы. На паказе брэнда Puppets&Puppets манекеншчыца выйшла на подыум у класічных сініх джынсах, ліловым швэдры з лагатыпам маркі і... чапцы з вялізным кавалкам сыру. («— У цябе ёсць якія-небудзь фантазіі?» — «Часам я мару пра метровы бутэрброд з вяндлінай». — «Не, я мела на ўвазе тыя фантазіі, што «гарачыя». — «О, так, я падагрэў бы хлеб у мікрахвалеўцы».)

Калі мужчыны ў туфлях на абцасах ужо даўно перасталі здзіўляць прыхільнікаў моды, дык да панчох і калготак ім яшчэ толькі трэба будзе прывыкнуць, паведамляе Lenta.ru. («Фраза «прачынацца з пеўнямі» ў наш час набыла зусім іншы сэнс...») Дызайнеры амерыканскага брэнда ThreeASFOUR прадставілі сваю версію сучаснага мужчынскага ўбору: манекеншчык выйшаў на подыум у футурыстычным вобразе, што складаецца з басаножак на платформе, калготак і пальчатак з прынтам, якія нагадваюць афарбоўку матыля, а таксама ў аб'ёмнай сукенцы з элементаў у форме крылаў. («Выдуманае назад не ўдумаць».) Дарэчы, менавіта сімвал матыля, папулярны ў 90-х гадах, стаў яшчэ адным трэндам 2021 года. У моду вярнуліся аксесуары, татуіроўкі і аплікацыі на вопратцы ў выглядзе гэтай казуркі.

Адкрыты жаночы ўбор, аб'ёмны капялюш з вэлюмам, абцасы і яркі макіяж сталі атрыбутамі новага мужчыны XXI стагоддзя. («Забарона на сварку мацюкамі не пужала Наташаньку. Яна ўмела мацюкамі глядзець».) Прынамсі, прыкладна такая тэндэнцыя шырока распаўсюдзілася сярод мужчынскай паловы гасцей на Тыдзень моды ў абедзвюх сталіцах... Ну што на гэта скажаш... («Усё жыццё тэатр, а я ўпаў са сцэны».)

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Самае галоўнае — трэба быць актыўнымі»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Раскажыце пра сваю малую радзіму. Напэўна, карані вашага патрыятызму адтуль?***

— Родам я з Касцюковіч. Пераехала ў Мінск у 2007 годзе. Калі гаварыць пра мой родны горад, то першая асацыяцыя — гэта цэментны завод. Горад быў заснаваны дзякуючы завадчанам. Успамінаюцца рэчкі Жадунька, Бесядзь. Мястэчка не турыстычнае, гэта звычайны прамысловы горад. Мы жылі небагата ў прыватным сектары, побач быў лес, мы бегалі захад праводзіць, світанак сустракалі, пастаянна хадзілі ў паходы. Мяне бацька заўсёды вучыў: бяры сілы ад прыроды. Мы з ім іншы раз пойдзем у лес, ён падвядзе мяне да дрэва — дуба векавечнага — вось, кажа, прыхініся да яго, бяры ад яго сілы. Верагодна, ад бацькоў і перадалася вось гэтая любоў да зямлі, якая перарасла ў любоў да людзей, горада, Прэзідэнта, педагогаў, якія мяне навучылі ўсяму, маю 4-ю школу ніколі не забуду, класныя былі педагогі, я ўдзячная ўсім.



**«Мы аб'ядналі моладзь, нам не важна, якія перакананні ў кожнага, галоўнае — разам рабіць лепш для краіны».**

***— Як праходзіць для вас Год народнага адзінства?***

— Першае, што зрабілі, дыялогавую пляцоўку «1+1». У ТікТок на прамыя эфіры запрашалі моладзь з рознымі палітычнымі перакананнямі. Мы сустракаліся ў кавярні і стасаваліся ўжывую. Я хачу данесці да людзей, што мы такія ж, таксама хочам перамен. Многія мне потым казалі, маўляў, калі я ішоў, думаў, што рукі табе не падам, а мы напрыканцы абдымаліся і сыходзілі найлепшымі сябрамі з гэтых сустрэч *(смяецца)*.

Яшчэ арганізоўвалі медыясустрэчы з прыхільнікамі ТікТок, яны прайшлі на Мінскім моры і ў Брэсце. Нам не важна, якія погляды ў чалавека, мы ўвогуле палітыку на гэтых сустрэчах не закранаем. Гэта таксама крок да яднання. У кожнага свая аўдыторыя, у многіх ціктокераў мільённыя прагляды, а гэта значыць, што яны не будуць настройваць аўдыторыю варожа. І мяне гэта радуе... Так, быў складаны перыяд, але мы яго прайшлі і цяпер наладжваем кантакты, стасуемся. У Брэсце, напрыклад, у нас былі Media Party, Likee Party.



У парку 1 Мая была сцэна, спявалі, займалі дзетак, было вельмі весела. Усё гэта таксама без палітыкі. Мы аб'ядналі моладзь, нам не важна, якія перакананні ў кожнага, галоўнае — разам рабіць лепш для краіны.

***— Куды можна звярнуцца маладым людзям, якія, як і вы, актыўныя і жадаюць прасоўваць свае праекты?***

— Мне часта пішуць, маўляў, БРСМ нічога не робіць, а я заўсёды адказваю ў прамых эфірах: дык прапаноўвайце, уносьце сваё, нададзім арганізацыі новае дыханне! Раней я таксама разважала, як многія. Але цяпер разумею, што і БРСМ, і «Белая Русь» — гэта ўсе мы. Мы самі можам прапаноўваць ідэі, я асабіста так шмат новага прапаноўваю, і мяне чуюць і дзяржава, і асобныя маладзёжныя платформы. Хоць у мяне няма ні сувязяў, ні грошай — я звычайны чалавек з Касцюковічаў. Калі ідэя вартая і можа прынесці карысць, яе запускаюць у жыццё. Не трэба чакаць, што хтосьці за цябе нешта зробіць.

У нас на тэлеканале ёсць рубрыка «Маладзёжны парламент», там столькі адукаваных хлопцаў і дзяўчат, у іх столькі ідэй! Я пытаюся ў іх, ці сапраўды гэта ўсё працуе, яны расказваюць, што так, калі, вядома, гэта класны праект. Нават калі ты з маленькага гарадка, цябе заўважаць.

***— Вы актыўна вандруеце па Беларусі?***

— Калі прымаю ўдзел у патрыятычным аўтапрабегу, стараюся захаваць на камеру новыя мясціны. Нядаўна адпачывалі з бацькамі ў санаторыі ў Пружанскім раёне, дык не змагла прайсці міма — наведала Ружанскі палац, мне цікавая наша гісторыя.

***— Раскажыце больш падрабязна пра аўтапрабегі...***

— У іх можа паўдзельнічаць любы, іх арганізатары — грамадскае аб'яднанне «Патрыёты Беларусі». У аўтапатрыётаў ёсць у «Тэлеграме» чат, я таксама закідваю інфармацыю ў Instagram, калі плануецца паездка.

Звычайна ўсе збіраюцца на сваіх машынах, але калі ты не ўпэўнены ў сілах, што праедзеш такі доўгі шлях, можна звярнуцца да арганізатараў, яны знойдуць месца. На паліва скідваемся. Кожны аўтапрабег своеасаблівы — доўжыцца, бывае, два дні. Спыняемся ў гістарычных мясцінах, каля помнікаў ды іншых знакавых аб'ектаў, каб удзельнікі даведаліся больш пра краіну.

***— Сцюша, што вы пажадаеце нашым чытачам у Год народнага адзінства?***

— Мы беларусы, і самая каштоўнае, што ў нас ёсць, — наша краіна. Таму, якія б ні былі паміж намі непаразуменні, розныя меркаванні, мы павінны быць разам. Павінны берагчы вось гэты кавалак зямлі, любіць нашу радзіму. Хачу пажадаць усім пазітыву, усмешак, памятаць, што мы разам, што мы адзіныя, непераможныя *(усміхаецца)*. І самае галоўнае — трэба быць актыўнымі, неабходна самім прапаноўваць, ініцыіраваць праекты. Беражыце сябе, свае сем'і, радзіму. Усіх люблю!

**Надзея ЗУЕВА.**
**Фота з архіва гераіні.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 13.10.2021 г.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «КУПАЛИНКА», Минская обл., г. Солигорск, ул. Заслонова, 58** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Здание бокса гаражей**, инв. № 644/С-59172, общ. пл. 138 кв. м. Ограничения / обременения: аренда.
**Холодильная станция**, инв. № 644/С-59422, общ. пл. 621,8 кв. м.
**Резервуар для воды**, инв. номер 644/С-59421, общ. пл. 94,5 кв. м. Составные части и принадлежности: два дыхательных устройства.
**Адрес:** Минская обл., Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. Константина Заслонова, 58, 58/1, 58/2.
**Сведения о земельном участке**: предоставлен на праве аренды по 25.03.2120 для строительства и обслуживания здания и сооружений и объектов иного назначения, общ. пл. 0,4189 га.
**Начальная цена (с НДС 20 %) – 423 257,05 бел. руб.**
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (**BYN**) перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001** в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **4 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» 23.09.2021

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 25.10.2021 с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 21.10.2021 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **+375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Планар» (продавец) проводит открытый аукционпо продаже**

## ЗДАНИЯ ЦЕХА ДЕРЕВООБРАБОТКИ

*(составные части и принадлежности: пристройка),*
**общей площадью 1 307,1 кв. м с инв. № 601/С-27937, расположенного на земельном участке площадью 0,3209 га с кадастровым номером 623288005101000004**
*(право постоянного пользования)*
**по адресу: Минская область, Логойский район, Янушковичский с/с, д. Жабичи, ул. Метростроевская, 20Г.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **352 675,30** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **35 267,00** бел. руб.
*Начальная цена снижена на 20 %.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.** Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 31.07.2021.

Аукцион состоится **26.10.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.10.2021** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: (8044) 797-93-83.**

УНП 100104937

---

ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЯВЛЕННОМ АУКЦИОНЕ И ПРЕДМЕТЕ АУКЦИОНА

**Организатор аукциона:** комитет «Минскоблимущество», тел.: (8017) 5004711, 5168054, 5168055.

**День и время проведения аукциона: 12 ноября 2021 г. в 11.00.**

**Недвижимое имущество:**
**капитальное строение** (инв. № 633/С-10013) –

## ОДНОЭТАЖНОЕ ЗДАНИЕ КОТЕЛЬНОЙ,

общ. пл. 252,3 кв. м, 1985 г. п.
(принадлежности: линия электропередачи кабельная);

**капитальное строение** (инв. № 633/С-8372) –

## ОДНОЭТАЖНОЕ, ФУНДАМЕНТНО-БЛОЧНОЕ ОВОЩЕХРАНИЛИЩЕ,

общ. пл. 53,00 кв. м, 1964 г.п.,
расположенные по адресу: Минская обл., Мядельский район, Мядельский с/с, 12, 13 в районе аг. Бояры.
**Начальная цена недвижимого имущества: 53 300,00 руб**.

Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Минского областного исполнительного комитета **www.minsk-region.gov.by** (http://minsk-region.gov.by/dlya_delovykh_lyudey/auktsiony), Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by** (http://gki.gov.by/ru/auction).

УНП 600380436

---

**ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Табаквинторг» (продавец) извещает о проведении 16 ноября 2021 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2**

| |
|---|
| **ЛОТ № 1:** изолированное помещение с инвентарным номером 300/D-678 площадью 960,7 кв. м, назначение – торговое помещение, наименование – торговое помещение |
| **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Привокзальная, 2 А-109 |
| **Информация о земельном участке:** кадастровый номер 340100000001000921, площадь 0,1871 га (доля в праве 37/250); назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания многоквартирных жилых домов, встроенных изолированных помещений, не относящихся к жилищному фонду |
| **Начальная цена продажи с учетом НДС: 2 191 000,00** бел. руб. |
| **Задаток (3 %) с учетом НДС: 65 730,00** бел. руб. |
| **Дополнительные условия:** заключены договора аренды: РУП «Фармация» действует до 24.09.2024 г.; ОАО «Белинвест Банк» – до 01.10.2022 г.; ООО «Городская сеть терминалов» – до 11.11.21 г.; ООО «Тимоша бел» – до 11.04.22 г.; ИП Мишанина М.Н. – до 31.12.2021 г. |

**Продавец: ОАО «Табаквинторг»**, г. Гомель, ул. Могилевская, 1а. Контактный телефон +375 29 334-04-60; +375 44 599-02-90.

**Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной аукционистом цены продажи предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца ОАО «Табаквинторг»: р/с BY44PJCB3012 4055581000000933 ОАО «Приорбанк» (г. Гомель, ул. Красноармейская, 3а), БИК PJCBBY2X, УНП 400078357.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений заканчивается 15.11.2021 г. в 16.00.**

**Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность; представителем гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания протокола; расчеты производить в следующем порядке: четырьмя равными долями каждые **10 (десять)** календарных дней со дня заключения договора купли-продажи; возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 1,0 % в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

---

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Мозырьпромстрой»** (УНП 400091065) 247760, Гомельская обл. Мозырский р-н, г. Мозырь, Интернациональная, 109, тел. +375 (236) 32-75-19.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **15 ноября 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение с инв. № 330D-62905 (квартира), ул. Артюшенко М. И., 18-1, общ. пл. 178,8 кв. м | 205 196,41 |
| 2 | Изолированное помещение с инв. № 330D-62906 (квартира), ул. Артюшенко М. И., 18-2, общ. пл. 178,8 кв. м | 205 196,41 |
| 3 | Изолированное помещение с инв. № 330D-62907 (квартира), ул. Прудковская, 39-1, общ. пл. 178,8 кв. м | 204 520,55 |
| 4 | Изолированное помещение с инв. № 330D-62907 (квартира), ул. Прудковская, 39-2, общ. пл. 178,8 кв. м | 204 520,55 |
| **расположенные по адресу: Гомельская обл., Мозырский р-н, Козенский с/с, д. Дрозды** | | |

Телефон для ознакомления и осмотра +375 33 617 70 35.

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 09.00 15.10.2021 г. по 17.00 12.11.2021 г.: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Единственный участник торгов может купить предмет торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 календарных дней со дня проведения торгов.

---

Приорбанк RBI Group

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2021 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 1 октября 2021 | На 1 января 2021 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 211 203 | 182 493 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 811 827 | 644 866 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 856 132 | 705 267 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 428 773 | 446 399 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 2 764 749 | 3 058 209 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 4 564 | 274 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 25 501 | 33 380 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 172 137 | 165 812 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 1 764 | 1 363 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 813 | 1 214 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 31 206 | 44 344 |
| 15 | **ИТОГО активы** | **11** | | **5 308 669** | **5 283 621** |
| 15 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 317 695 | 173 570 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 4 002 048 | 4 164 095 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 2 921 | 59 636 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 1 929 | 11 566 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 42 382 | 60 119 |
| 23 | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **4 366 975** | **4 468 986** |
| 24 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 86 148 | 86 148 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 180 609 | 180 609 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 71 643 | 73 654 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 603 294 | 474 224 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 941 694 | 814 635 |
| 31 | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **5 308 669** | **5 283 621** |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2021 г.

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | На 1 октября 2021 | На 1 октября 2020 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 229 160 | 225 744 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 75 583 | 77 185 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 153 577 | 148 559 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 184 075 | 156 616 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 94 810 | 80 463 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 89 265 | 76 153 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (502) | (3 358) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 49 948 | 71 075 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 14 262 | 1 537 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 10 908 | 60 477 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 15 538 | 16 486 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 135 085 | 134 897 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 11 545 | 12 674 |
| 15 | Прибыль до налогообложения | 211 | | 164 550 | 102 404 |
| 16 | Расход по налогу на прибыль | 212 | | 36 574 | 25 987 |
| 17 | **ПРИБЫЛЬ** | **2** | | **127 976** | **76 417** |

Временно и.о. Председателя Правления В.В. Дедюль

Главный бухгалтер В.В. Манцивода

Финансовая отчетность размещена на интернет-странице банка: **https://www.priorbank.by/kvartal-nye-otcety**

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 24.07.2019 года. УНП 100220190

Глыбінка

# ДОЎСКАЯ ЗАГАРТОЎКА

## Асаблівасці работы ўчастковай бальніцы ў перыяд пандэміі

**У зоне абслугоўвання Доўскай участковай бальніцы Рагачоўскага раёна — амаль 3300 чалавек. Па медыцынскую дапамогу сюды звяртаецца насельніцтва Доўскага і Курганскага сельсаветаў — гэта жыхары, ні больш ні менш, 25 населеных пунктаў. Акрамя таго, бальніца бярэ на сябе медабслугоўванне дзяцей з Жураўіцкага і Званецкага сельсаветаў.**



Пандэмія каранавіруса ўнесла свае карэктывы ў функцыянаванне сельскай установы аховы здароўя. Кваліфікаваная меддапамога ў гэтым аддаленым кутку Рагачоўшчыны заўсёды была вельмі запатрабаваная. Да райцэнтра — 30 кіламетраў, а размешчаны Доўск на перакрыжаванні буйных трас Магілёў — Гомель і Бабруйск — Слаўгарад. У час пандэміі ўчастковая амбулаторыя ўзяла на сябе значную частку службы медабслугоўвання сельскіх жыхароў. Наладзіць работу ўдалося ў тым ліку дзякуючы падтрымцы спецыялістаў Рагачоўскай цэнтральнай райбальніцы.

У Доўску абслугоўванне пацыентаў арганізавалі з улікам усіх супрацьэпідэмічных мер, скарэкціравалі работу ўрачоў, медыцынскіх сясцёр і малодшага медыцынскага персаналу так, каб найбольш эфектыўна размеркаваць нагрузку. **Галоўны ўрач Доўскай участковай бальніцы Наталля ГАЎРУШКА** *(на фота)* кажа, што не перастае здзіўляцца стойкасці, уменню свайго калектыву ў цяжкія часы згуртавацца ў моцную каманду.

— Цяжка нават кагосьці вызначыць асобна, каму вельмі прызнаная за работу, — адзначае Наталля Яўгенаўна. — Проста нізкі паклон усім.

У амбулаторыі ўрачы агульнай практыкі вядуць штодзённы прыём пацыентаў. Аддзяленне стацыянара — 65 ложкаў — ніколі не пустуе. Большая частка месцаў адведзена для аддзяленняў сястрынскага догляду і тэрапеўтычнага. У апошнім, дарэчы, цяпер ідзе рамонт за сродкі, сабраныя калектывам. Ёсць у бальніцы стаматалагічны, фізіятэрапеўтычны, рэнтгеналагічны кабінеты і лабараторыя. Акрамя таго, у Доўскай участковай бальніцы працуе паліятыўнае аддзяленне, куды звяртаюцца жыхары з усяго Рагачоўскага раёна.

— Наша аддзяленне паліятыўнай дапамогі разлічана на 15 месцаў, — тлумачыць **урач-тэрапеўт Леакадзія ПУТРЫК**. — Мы аказваем меддапамогу пацыентам з хранічнымі захворваннямі, анкалогіяй, калі патрабуецца карэкцыя асноўнага лячэння, абязбольванне, дэтаксікацыйная тэрапія. Тое, на якім узроўні наладжана работа паліятыўнага аддзялення, — значная заслуга нашых санітарачак і медсясцёр, старэйшай медсястры Алены Захаранкі, бо паступаюць да нас і вельмі цяжкія пацыенты.

У паліятыўным аддзяленні лечацца і пацыенты са складанымі сардэчна-сасудзістымі, лёгачнымі і іншымі захворваннямі. У асобных палатах — тэлевізары, у кожнай — зручны санітарны блок. Пры неабходнасці выкарыстоўваюцца супрацьпролежневыя матрацы. Леакадзія Путрык распавядае: пацыенты аддзялення — людзі, якіх сваякі прывозяць на лячэнне менавіта ў Доўск.

— Мая работа — мае хворыя. Палегчыць іх стан. Асабліва каштоўная наша дапамога для тых, у каго не засталося сваякоў, у каго дзеці ў Расіі, Украіне, далёка. Спачатку тыя, хто трапляе да нас, думаюць, што тут вёска, таму дрэнна, напэўна, будзе, потым палечацца і просяцца толькі сюды, да нас у Доўск, — дзеліцца ўрач.

Дарэчы, доктар паліятыўнага аддзялення Леакадзія Вітольдаўна Путрык у свой час больш як 20 гадоў узначальвала Доўскую ўчастковую бальніцу. Яе муж, Яўген Мікалаевіч Путрык, усё сваё жыццё адпрацаваў у Доўскай бальніцы загадчыкам хірургічнага аддзялення. Леакадзія Вітольдаўна і Яўген Мікалаевіч — бацькі сённяшняга кіраўніка медустановы Наталлі Гаўрушкі. Дынастыя вясковых урачоў заўсёды ганарылася месцам жыцця і работы. І на сваім прыкладзе пераконвала, што жыццё ў глыбінцы мае шмат пераваг.

Сёння галоўнаму ўрачу прыходзіцца займацца праблемай замацавання кадраў у сельскай мясцовасці. Рэцэпт, кажа, агульнавядомы: малады спецыяліст замацуецца, калі ў яго ёсць магчымасць кар'ернага росту, жыллё і... асабістае жыццё. Праўда, апошняе не заўсёды залежыць ад загадаў начальства. Усміхаецца: пажаніць, вядома, не змогуць, але ж пазнаёміць з добрым хлопцам ці дзяўчынай — чаму не? А там ужо — як складзецца:

— У вялікім горадзе не атрымаеш таго вопыту, той практыкі, якія тут ёсць. Урач можа хутка заняць пэўную пасаду, рэалізаваць свае амбіцыі. А яшчэ, лічу, вельмі важная атмасфера ў калектыве. Чалавек павінен адчуваць, што ён неабходны. Важна, каб ён не саромеўся нешта спытаць у старэйшага калегі, — упэўненая галоўны ўрач. — Я ўсім кажу: не пужайцеся вёскі. Усё тут зручна: кватэра, работа праз дарогу, дзіцячы садок і школа побач. Школа ў нас вельмі добрая. Ёсць таксама музычная школа. Перакрыжаванне дарог дае свае перавагі: сеў на машыну і куды хочаш едзь — хоць у Гомель, хоць у Мінск, хоць далей. Таму я за ўсё жыццё павандравала больш, чым многія з маіх калег у горадзе.

Галоўнае ў рабоце на вёсцы, упэўненая Наталля Гаўрушка, — зразумець і прывыкнуць да людзей.

— Таму што гэта вельмі вялікая розніца — сельскае і гарадское насельніцтва. Тут, у вёсцы, мы — сям'я, — цвёрда верыць урач. — Гэта асабліва добра відаць цяпер, падчас работы ў пандэмію. Людзі ведаюць свайго вясковага доктара, давяраюць яму, ты ведаеш усіх родных пацыента, можаш заручыцца іх дапамогай, калі, напрыклад, стары чалавек адмаўляецца ад лячэння ці ігнаруе парады ўрача, — расказвае Наталля Гаўрушка. — У памяці многіх пажылых вяскоўцаў я ўсё яшчэ тая маленькая Наталька, якая ўсё дзяцінства правяла з татам і мамай на прыёмах бальніцы. Але цяпер, пераступіўшы яе парог, я для іх — Наталля Яўгенаўна і нясу адказнасць за іх. Вядома часам па вуліцы ідзеш, і людзі старога пакалення, далёкія ад медыцыны, крычаць: «Наталля, а ты будзеш прымаць сёння?» Я адказваю: «Так». Ніколі не крыўдую на панібрацтва.

Цікава, што ў Доўску свая бальніца з 1914 года. Наталля Яўгенаўна збірае ўспаміны аб рабоце ўсіх галоўных дактароў з дарэвалюцыйных часоў і марыць аб стварэнні музея бальніцы.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**


## Извещение о проведении 26 октября 2021 года повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

**Сведения о продаваемом имуществе**

| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Сведения о земельном участке | Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение* с инв. номером 110/С-113573, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 20А, общей площадью 1 181,8 кв. м, составные части и принадлежности: пристройка, отапливаемая пристройка, наименование – здание промбазы, назначение – здание специализированное иного назначения | Площадь – 0,1607 га, кадастровый номер – 141000000001005239 | 133 200,0 | 13 300,0 |
| 2 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117135, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/2, общей площадью 684,9 кв. м, наименование – здание арочного склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,2340 га, кадастровый номер – 141000000001005245 | 49 800,0 | 4 900,0 |
| 3 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117136, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/3, общей площадью 209,0 кв. м, наименование – мебельный склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,0427 га, кадастровый номер – 141000000001005219 | 25 260,0 | 2 500,0 |
| 4 | Капитальное строение** с инв. номером 110/С-113574, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/4, общей площадью 466,2 кв. м, наименование – здание холодильника, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,0997 га, кадастровый номер – 141000000001005218 | 61 200,0 | 6 100,0 |
| 5 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117144, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/6, общей площадью 1 212,7 кв. м, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,2238 га, кадастровый номер – 141000000001005216 | 146 400,0 | 14 600,0 |
| 6 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117137, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/9, общей площадью 855,6 кв. м, составные части и принадлежности: этаж подвальный, наименование – овощной склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,1865 га, кадастровый номер – 141000000001005217 | 102 000,0 | 10 200,0 |
| 7 | Капитальное строение*** с инв. номером 110/С-114895, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/10, общей площадью 737,0 кв. м, составные части и принадлежности: навес, наименование – здание овощехранилища, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,1753 га, кадастровый номер – 141000000001005244 | 88 200,0 | 8 800,0 |
| 8 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117138, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/11, общей площадью 775,1 кв. м, составные части и принадлежности: этаж подвальный, наименование – овощехранилище, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,2055 га, кадастровый номер – 141000000001005211 | 81 600,0 | 8 100,0 |
| 9 | Капитальное строение с инвентарным номером 110/С-117143, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/12, общей площадью 212,7 кв. м, наименование – здание столярного цеха, назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель | Площадь – 0,0548 га, кадастровый номер – 141000000001005212 | 26 640,0 | 2 600,0 |
| 10 | Капитальное строение**** с инвентарным номером 110/С-114896, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/13, общей площадью 218,6 кв. м, наименование – здание лукохранилища, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,0656 га, кадастровый номер – 141000000001005213 | 25 920,0 | 2 500,0 |
| 11 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117142, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/14, общей площадью 291,7 кв. м, наименование – здание кирпичного гаража, назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции) | Площадь – 0,0980 га, кадастровый номер – 141000000001005240 | 34 740,0 | 3 400,0 |
| 12 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117145, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/15, общей площадью 703,6 кв. м, наименование – здание склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,2034 га, кадастровый номер – 141000000001005243 | 82 200,0 | 8 200,0 |
| 13 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117140, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/16, общей площадью 227,5 кв. м, составные части и принадлежности – этаж подвальный, наименование – здание коптильного цеха, назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака | Площадь – 0,1566 га, кадастровый номер – 141000000001005214 | 27 000,0 | 2 700,0 |
| 14 | Капитальное строение***** с инв. номером 110/С-117139, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/17, общей площадью 317,2 кв. м, наименование – склад шиферный, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,1457 га, кадастровый номер – 141000000001005215 | 23 820,0 | 2 300,0 |

**Недвижимое имущество выставлено на торги по фактическому состоянию, рекомендуется осмотр**

**Ограничения (обременения): аренда до 31.12.2021 г. **Ограничения (обременения): аренда до 11.07.2022 г. ***Ограничения (обременения): аренда до 31.03.2022 г. ****Ограничения (обременения): аренда до 30.11.2021 г. *****Ограничения (обременения): аренда до 30.11.2021 г.*

**Условия торгов**: победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 2 (двух) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов

**Продавец имущества:** ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах 26.10.2021 по предмету торгов № _ _.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **26 октября 2021 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 15.10.2021 по 22.10.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (017) 240-62-06.

**Телефоны для справок:** (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 240-62-06 (ОАО «ДОРОРС»). Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

# ВАРШАВА НА ВЫХАД

## Навошта Польшча кідае выклік Еўрасаюзу?

**У Польшчы сотні тысяч чалавек выйшлі на акцыі пратэсту супраць спрэчнага рашэння Канстытуцыйнага суда аб прыярытэце польскай Канстытуцыі перад заканадаўствам Еўрасаюза, паведаміла Deutsche Welle. Дэманстранты сабраліся на Замкавай плошчы. «Мы застаёмся!», «Мы — Еўропа!» — скандзіравалі яны, размахваючы сцягамі Польшчы і Еўрапейскага саюза. Акрамя таго, пратэсныя акцыі прайшлі ў Гданьску, Познані, Шчэціне, Кракаве і шэрагу іншых гарадоў. Канстытуцыйны суд Польшчы раней вынес рэзанансны вердыкт, палічыўшы, што асобныя палажэнні заканадаўства ЕС супярэчаць Асноўнаму закону краіны. Гэтае рашэнне не толькі распальвае маштабны канфлікт паміж Брусселем і Варшавай, але і ўносіць раскол у грамадства. Навошта Польшча кідае выклік Еўрасаюзу?**



### АПТЫМІСТЫ І СКЕПТЫКІ

Былыя члены сацыялістычнага блока, на той момант найбольш бедныя краіны Еўропы — не толькі Польшча, але і Балгарыя, Венгрыя, Славакія, Румынія, Чэхія, а таксама краіны Балтыі, — увайшлі ў Еўрасаюз да другой паловы 2000-х. З уступленнем у ЕС была звязана маса надзей, пад еўрапейскія нормы актыўна перакройвалася нацыянальнае заканадаўства. Аднак за 15 гадоў членства ў ЕС выйсці на адзін узровень з Заходняй Еўропай гэтым краінам не ўдалося: і ў 2020-м, паводле даных Еўрастата, узровень ВУП на душу насельніцтва там застаецца найменшым у супольнасці. Невысокім застаецца і ўзровень жыцця, таму моладзь без віз з'язджае працаваць у тую ж Германію, а насельніцтва ўнутры краіны старэе. Прыход да ўлады еўраскептыкаў ці, прынамсі, кансерватараў-нацыяналістаў на гэтым фоне быў відавочны: у Венгрыі і Польшчы ён не прымусіў сябе чакаць, адзначыла ТАСС.

**Паводле даных апытання польскага агенцтва сацыяльных даследаванняў SW Research, праведзенага для газеты Rzeczpospolita, 62,2 працэнта рэспандэнтаў выступаюць за тое, каб Польшча засталася ў ЕС. Яшчэ 17 % жадаюць выхаду з аб'яднання, што з'яўляецца найбольшым значэннем за 17 гадоў — з моманту ўступлення краіны ў Еўрасаюз у 2004-м.**

У Польшчы еўраскептыкі, тварам якіх можна назваць лідара і сузаснавальніка партыі «Права і справядлівасць» (PiS) Яраслава Качыньскага, змянілі еўрааптымістаў у 2015 годзе. Практычна адразу яны ініцыіравалі рэформу Канстытуцыйнага суда, запоўніўшы аднадумцамі частку вакансій у ім і ўзмацніўшы патрабаванні да прыняцця рашэнняў. Еўракамісія тады адразу запусціла працэдуру праверкі польскага заканадаўства патрабаванням вяршэнства права і ў выніку да канца 2017-га аб'явіла аб запуску санкцыйных працэдур у дачыненні да Варшавы, выкананне якіх пагражала пазбаўленнем права голасу ў Савеце ЕС. Непасрэдных наступстваў для Польшчы гэта, зрэшты, не пацягнула — усе рашэнні ў Еўрасаюзе павінны прымацца аднагалосна, а Венгрыя адразу заявіла, што накладзе вета на санкцыі супраць Варшавы.

Усё гэта дазволіла PiS разгарнуць судовую рэформу максімальна шырока: далей адбылося зніжэнне пенсійнага ўзросту суддзяў — і магчымасць замены на больш лаяльных юрыстаў значнай часткі суддзейскага корпуса. Вянком жа рэформы, што выклікаў максімальнае раздражненне Брусселя, стала зацвярджэнне дысцыплінарнай адказнасці суддзяў за «цяжкасць функцыянавання судовай сістэмы» і палітычную актыўнасць.

Не дадавалі паразумення Брусселю і Варшаве і іншыя навацыі, праведзеныя Качыньскім праз сейм. Сярод іх — пераход да прызначэння кіраўнікоў дзяржаўных СМІ міністрам дзяржмаёмасці, аб'яднанне пасад генпракурора



і кіраўніка Мінюста, пашырэнне паўнамоцтваў сілавых структур. З адносна нядаўніх — забарона абортаў нават пры прыроджаных паталогіях, якая выклікала працяглыя шматтысячныя пратэсты. У выніку Варшава пачала папросту ігнараваць прэтэнзіі з боку Брусселя, заўважыла ТАСС. Адным з апошніх прыкладаў стала адмова Польшчы закрываць шахту «Тураў» каля чэшскай граніцы — адна з найбольш брудных вытворчасцяў у Еўропе, — нягледзячы на рашэнне Суда ЕС.

### ПАКІНУЦЬ БЕЗ ГРОШАЙ

Рэзанансны вердыкт вышэйшай судовай інстанцыі краіны быў абнародаваны роўна тыдзень таму, а разглядалася справа па ініцыятыве прэм'ер-міністра Матэуша Маравецкага. Канстытуцыйны суд пастанавіў, што чатыры палажэнні Дагавора аб Еўрапейскім саюзе супярэчаць польскай Канстытуцыі і не павінны пераважаць над ёй. У гэтых палажэннях гаворыцца пра павагу да чалавечай годнасці, свабоды, дэмакратыі, аб вяршэнстве права і роўнасці, а таксама аб юрысдыкцыі Еўрапейскага суда. На думку польскіх юрыстаў, гэтыя артыкулы дагавора ствараюць магчымасць таго, што еўрапейскія суды могуць адмяніць дзеянне польскай Канстытуцыі, у тым ліку калі ставяць пад сумнеў законнасць прызначэння суддзяў у краіне.

Звады вакол польскай судовай рэформы цягнуцца з 2017 года, калі кіручая партыя «Права і справядлівасць» ініцыіравала абнаўленне судаводства. У Брусселі рэформу неадназова крытыкавалі, адзначалі, што яна вядзе да ўсталявання палітычнага кантролю над судамі і пазбаўлення грамадзян Польшчы, якія з'яўляюцца і грамадзянамі ЕС, права на незалежны судовы працэс. Суд Еўрапейскага саюза ў Люксембургу ў ліпені гэтага года пастанавіў, што справа, якую задумала Варшава, падрывае незалежнасць суддзяў і несумяшчальная з законамі ЕС.

Дзяржсакратар пры МЗС Францыі Клеман Бон назваў апошняе рашэнне польскага суда атакай на ЕС. «Польскія ўлады не паважаюць каштоўнасці і фундаментальныя правілы Саюза», — сказаў ён і прыгразіў Варшаве адмовай у выдзяленні сродкаў ЕС на аднаўленне нацыянальнай эканомікі пасля пандэміі. Францыя і Германія выпусцілі сумесную заяву, у якой нагадалі, што членства ў ЕС «крочыць поруч з поўным і безумоўным захаваннем агульных каштоўнасцяў і правілаў». Польшча з'яўляецца ключавым членам ЕС, усе ў аб'яднанні абавязаны выконваць гэтыя правілы, і такое абавязацельства носіць не маральны, а юрыдычны характар, падкрэслілі міністры замежных спраў дзвюх краін Жан-Іў Ле Дрыян і Хайка Маас. Кіраўнік Еўракамісіі Урсула фон дэр Ляен выказала занепакоенасць рашэннем Канстытуцыйнага суда Польшчы.

Старшыня Еўрапарламента Давід Сасолі заявіў, што вердыкт польскага Канстытуцыйнага суда нельга пакідаць без наступстваў. Паводле слоў спікера кансерватыўнай Еўрапейскай народнай партыі (EVP) у Еўрапарламенце Жэрона Ленаерса, гэта «напад на ўвесь ЕС», а ўрад у Варшаве больш не можа карыстацца даверам. Фракцыя сацыялістаў у Еўрапарламенце таксама раскрытыкавала рашэнне польскага КС. «Чорны сцэнарый для Польшчы становіцца рэальнасцю», — заявілі там. Чытачы нямецкага выдання Der Spiegel палічылі, што адсутнасць Польшчы ў ЕС якасна не адаб'ецца на аб'яднанні.

Па даных Politico, у Еўракаміcіі два варыянты, як паўплываць на Варшаву. Першы — ініцыіраваць судовую працэдуру. Другі — прыпыніць фінансаванне па лініі ЕС. Перш за ўсё размова ідзе аб Фондзе аднаўлення і ўстойлівасці аб'ёмам у €750 млрд, які быў створаны для аднаўлення эканомік краін, што пацярпелі ад пандэміі. Польшча ўхваліла адпаведны план у пачатку мая, прэтэндуючы на 23 млрд у выглядзе грантаў ЕС і на больш 34 млрд у выглядзе крэдытаў. Першы транш аб'ёмам 13 % ад запаветнай сумы павінен быў паступіць у пачатку жніўня, але ЕС адклаў працэдуру разгляду заяўкі Варшавы. Еўракамісар па пытаннях эканомікі Паола Джэнтылоні патлумачыў затрымку якраз рознагалоссямі наконт вяршэнства права.

«Калі Брусель будзе стаяць на сваім і не выдзеліць гэтых сродкаў, здарыцца велізарны ўдар па іміджы «Права і справядлівасці», якая да гэтага часу пераконвала палякаў, што яна вядзе адносна ЕС жорсткую палітыку і ЕС саступае Варшаве. Да таго ж важкая частка выбаршчыкаў партыі ўлады — гэта так званы сацыяльны электарат, які «Права і справядлівасць» не перакanала галасаваць за сябе, а папросту купіла», — заўважыў «Бі-бі-сі» польскі палітолаг Антоні Дудэк.

### ГРАМАДЗЯНСКІ РАСКОЛ

«У нашай краіны ёсць толькі тры шляхі. Змяніць палажэнні дагавораў Еўрасаюза, што з'яўляецца фантазіяй; змяніць польскую Канстытуцыю, што сёння таксама нерэальна; ці проста пакінуць Еўрасаюз... Канстытуцыйны суд адкрыў нам шлях, скажу нават больш, шырока адчыніў для нас вароты да выхаду з Еўрасаюза і наклаў на ўладу прамое абавязацельства зрабіць крокі да выхаду з ЕС», — заўважыла выданню Onet.pl колішняя ўпаўнаважаная па правах чалавека прафесар Ева Лянтоўская.

Ініцыятарам цяперашняй маштабнай хвалі пратэстаў у Польшчы выступіў лідар апазіцыйнай ліберальнай партыі «Грамадзянская платформа», былы прэзідэнт Еўрасавета Дональд Туск. Ён заклікаў усіх, хто хоча абараніць еўрапейскую Польшчу, прыйсці на Замкавую плошчу ў Варшаве. На мітынгу Туск заявіў, што ўрад дамагаецца выхаду Польшчы з Еўрасаюза, каб «беспакарана парушаць правы грамадзян і прынцыпы дэмакратыі».

З Тускам рашуча не пагадзіўся фармальны ініцыятар судовых змяненняў. «Polexit — гэта фэйк. Гэта шкодны міф», — напісаў у сваім Facebook Маравецкі, які з 2017 года ўзначальвае ўрад, сфарміраваны кансерватыўнай партыяй «Права і справядлівасць».

Паводле даных апытання польскага агенцтва сацыяльных даследаванняў SW Research, праведзенага для газеты Rzeczpospolita, 62,2 працэнта рэспандэнтаў выступаюць за тое, каб Польшча засталася ў ЕС. Яшчэ 17 % жадаюць выхаду з аб'яднання, што з'яўляецца найбольшым значэннем за 17 гадоў — з моманту ўступлення краіны ў Еўрасаюз у 2004-м.

**Старшыня Еўрапарламента Давід Сасолі заявіў, што вердыкт польскага Канстытуцыйнага суда нельга пакідаць без наступстваў. Паводле слоў спікера кансерватыўнай Еўрапейскай народнай партыі (EVP) у Еўрапарламенце Жэрона Ленаерса, гэта «напад на ўвесь ЕС», а ўрад у Варшаве больш не можа карыстацца даверам. Фракцыя сацыялістаў у Еўрапарламенце таксама раскрытыкавала рашэнне польскага КС. «Чорны сцэнарый для Польшчы становіцца рэальнасцю», — заявілі там.**

«Сітуацыя ў Польшчы падобная на амерыканскую, дзе грамадства і эліты ў значнай ступені падзеленыя», — адзначыла rbc.ru вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута сусветнай эканомікі і міжнародных адносін РАН Ірына Кобрынская. Беларускі палітолаг Пётр Пятроўскі лічыць, што ў Польшчы адбываецца ўнутраны грамадзянскі раскол, які працягвае напампоўвацца. Такое меркаванне ён выказаў у эфіры «Альфа Радыё». Адпаведная сітуацыя, паводле слоў аналітыка, можа прывесці да глыбокага крызісу адносін Варшавы, унутранага палітычнага крызісу ў Польшчы.

